Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

12 МАЯ 2017 г. ПЯТНІЦА № 88 (28452)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Юр'я: святкуем разам**

СТАР. 5



**У Баянічы — на гулянічы**

СТАР. 13



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі:**

*«Ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях» паступова становіцца своеасаблівым брэндам развіцця і ўмацавання перш за ўсё эканамічнага супрацоўніцтва паміж краінамі Еўропы і Азіі. Сёння ва ўмовах замаруджвання росту сусветнай эканомікі гэтая ініцыятыва — новая крыніца стымулявання эканамічнага развіцця дзяржаў, размешчаных уздоўж новага Шаўковага шляху, і ў цэлым усяго рэгіёна».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.05.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8719 | ▼ |
| Еўра | 2,0372 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0708 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Сустрэча на алеі



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Вуліцу Гогаля ў Брэсце часта называюць і алеяй ліхтароў, і галерэяй пад адкрытым небам, бо на ёй усталяваны дзясятак самых розных і па кампазіцыі, і па сюжэце скульптур. Гараджане і турысты з задавальненнем наведваюць гэты куток горада. Брэсцкім дашкалятам падабаецца скульптура «юны чысцільшчык абутку».**

## ВІНТАЖ ПА-ГРОДЗЕНСКУ

### У горадзе над Нёманам узнаўляе работу «блышыны» рынак

**Наш карэспандэнт прайшлася па радах і прыцанілася да артэфактаў. Ці то надвор'е паспрыяла, ці гродзенцы сапраўды зацікавіліся даўнінай, але гандлёвыя рады былі цесна аблеплены на працягу амаль што пяці гадзін. Ды і месца для базара бойкае — цэнтр старога Гродна, плошча Савецкая, якая два стагоддзі таму называлася Рынычнай. Цяпер тут часта гандлююць — то велікодны кірмаш, то кірмаш для школьнікаў, то восеньскі продаж гародніны.**

Новы базар не прэтэндаваў на размах. Прадаўцы-калекцыянеры занялі два рады каля Палаца тэкстыльшчыкаў. Напярэдадні гандаль праходзіў у яго холе, бо ішоў дождж, а вось на другі дзень выйшлі на плошчу.

СТАР. 4



■ Медыяцыя ў дзеянні

## НЕ ПАНАЦЭЯ, А АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ ДАПАМОГА

### ў вырашэнні працоўных, сямейных і крымінальных канфліктаў

**Абавязковае накіраванне на медыяцыю (пазасудовае пагадненне бакоў) пры разглядзе шлюбна-сямейных праблем неабходна ўвесці ў адпаведны беларускі закон. Пры абмеркаванні праекта па ўдасканаленні закона медыятары прапаноўвалі ўжываць гэтую альтэрнатыву пры разглядзе спрэчак па аліментах, дзецях, маёмасці і іншых пытанняў. Разам з тым яны перасцерагаюць не насаджаць медыяцыю ў грамадстве загадным шляхам — менавіта з прычыны карыснасці гэтай працэдуры.**

### УСЁПРАНІКАЛЬНАЯ З'ЯВА

З дапамогай медыяцыі можна разабрацца і дамовіцца па розных пытаннях: працоўных, канфесіянальных, палітычных і іншых, сцвярджаюць спецыялісты. Пры гэтым пазасудовае пагадненне нельга лічыць панацэяй, бо ў некаторых выпадках кіравацца яго прынцыпамі немагчыма, напрыклад пры разглядзе сітуацыі, дзе ў сям'і існуе гвалт. А для найлепшага вырашэння сямейных канфліктаў неабходна наладжваць партнёрскія адносіны паміж медыятарамі, школай, сацыяльнымі работнікамі, натарыятамі і іншымі службамі, якія ўспрымалі б гэта як дапамогу ў сваёй рабоце.

У Партугаліі, напрыклад, многія канфлікты па хатнім гвалце вырашаюцца шляхам крымінальнай медыяцыі. Пра магчымасць карыстацца ёю і ў Беларусі казалі эксперты:

— Медыяцыя — гэта будучыня. Навакольны свет жорсткі, злачынствы здараюцца, аднак не ўсе асуджаныя такія ўжо нягоднікі і павінны сядзець за кратамі. Некаторыя маглі б працягваць прыносіць карысць грамадству і выхоўваць сваіх дзяцей, калі б да іх прымянілі працэдуры пакрыцця шкоды, прымірэння і іншыя. Думаю, мы стаім ля вытокаў развіцця гэтага руху ў Беларусі, — выказалася **Вікторыя СЯРГЕЕВА, рэгіянальны дырэктар Офіса Penal Reform International (Міжнародны турэмнай рэформы) па Расіі, Украіне і Беларусі.**

СТАР. 4

# Практычны вопыт, якім можам дзяліцца

## Прэзідэнт сустрэўся з губернатарам Растоўскай вобласці

**Далейшае павелічэнне тавараабароту, развіццё супрацоўніцтва ў сельскай гаспадарцы, пашырэнне прамыслова-кааперацыйных сувязяў... Гэта толькі некаторыя тэмы, якія абмеркаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы ў Палацы Незалежнасці з губернатарам Растоўскай вобласці Васілём Голубевым.**

Той факт, што Беларусь з Расіяй у цэлым, Растоўскай вобласцю ў прыватнасці, звязвае нашмат большае, чым просты тавараабмен, класічныя эканамічныя кантакты, нават не трэба асабліва абгрунтоўваць. Першае, на што звярнуў увагу беларускі лідар, вітаючы расійскага губернатара — гэта тое, што візіт дэлегацыі з Растова-на-Доне праходзіць, можна сказаць, падчас майскіх свят. І Беларусь, і Расія шануюць Вялікую Перамогу і памятаюць пра цану, якую заплаціў савецкі народ за яе.

### ІСЦІ АД ЗЯМЛІ

Калі ж гутарка зайшла пра эканамічныя паказчыкі супрацоўніцтва, то высветлілася: яны ўсяляюць аптымізм. Летась у Беларусі і Растоўскай вобласці атрымалася пераламіць тэндэнцыю па зніжэнні тавараабароту. Аб'ём узаемнага гандлю павялічыўся больш чым на 19% у параўнанні з 2015-м і склаў каля 340 мільёнаў долараў. Станоўчая дынаміка назіраецца і ў пачатку бягучага года.

— Няшмат такіх рэгіёнаў у Расіі, з якімі мы маем станоўчую дынаміку, — адзначыў Прэзідэнт. — 340 мільёнаў долараў, пад чатырыста — калі ўжо дакладна палічыць, — гэта добрая тэндэнцыя. Калі мы будзем дзейнічаць настойліва, сістэмна, то паўмільярднага рубяжа, якога нам вельмі трэба дасягнуць, я думаю, мы дасягнем.

Растоўская вобласць уваходзіць у лік найбуйнейшых сельскагаспадарчых рэгіёнаў Расіі, таму адным з перспектыўных кірункаў нашага ўзаемадзеяння, упэўнены Аляксандр Лукашэнка, павінна стаць супрацоўніцтва ў аграрнай сферы:

— Беларусь мае пэўны практычны вопыт, вы гэта ведаеце: і ў жывёлагадоўлі, і ў раслінаводстве, і ў апрацоўцы збожжа, гароднінных культур. Мы таксама вывучылі сусветны вопыт будаўніцтва і мадэрнізацыі цяперашніх фермаў пад малочнатаварныя комплексы. Мы гэтым зараз займаемся вельмі інтэнсіўна... Сховішчы для агародніны — мы захоўваем бульбу не ў буртах, як гэта некалі было. Усё, што павінна ляжаць у сховішчах, знаходзіцца там. Гэта дае нашай сельскай гаспадарцы пэўны плюс — бо мы маем магчымасць падчас дэфіцыту бульбы, гародніны даставаць са сховішчаў тавар і прадаваць яго на рынку.

Наша краіна валодае і цікавымі навуковымі напрацоўкамі ў сельскай гаспадарцы.

— Той вопыт, які назапашаны ў нас у сферы сельскай гаспадаркі, грунтуецца на сур'ёзнай навуковай аснове, — адзначыў Прэзідэнт. — Галоўнае, што мы не знішчылі тыя інстытуты, якія былі створаны ў савецкія часы ў акадэміях навук: інстытуты земляробства, раслінаводства, гароднінаводства, бульбаводства, жывёлагадоўлі... Больш за тое, яны сталі навукова-практычнымі: кожнаму з іх мы перадалі ва ўласнасць тысячы гектараў зямель.

Тыя гаспадаркі, якія былі перададзены навукова-практычным інстытутам, сталі перадавымі. Такім чынам, вучоныя даказалі: тое, што яны робяць, запатрабавана на зямлі.

### МЫ ЗА ПАРТНЁРСКІЯ АДНОСІНЫ

Традыцыйна Беларусь супрацоўнічае літаральна з усімі рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі. Гэта без перабольшвання галоўны рынак збыту для айчынных тавараў самага рознага кшталту. Тым не менш, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што з гэтым бываюць часам праблемы:

— У асноўным яны ствараліся штучна — гэта я ўжо зараз заўважыў, ды і вы, відаць, таксама... Да нас прэтэнзій не трэба прад'яўляць, і вы павінны разумець, чаму я ў тым ліку так востра на гэта рэагую. Калі нам было вельмі цяжка, мы тады адкладалі грошы і мадэрнізавалі гэтыя прадпрыемствы... І калі нас сёння папракаюць, што ў нас прадукты харчавання не тыя — гэта ўжо занадта. Каб вы ведалі, мы адзіная постсавецкая рэспубліка, якая захавала ДАСТы. І ў нас ДАСТы больш жорсткія, чым у Еўразаюзе. Чаму? Таму што як чарнобыльская рэспубліка мы былі вымушаны рабіць больш жорсткімі ДАСТы да прадуктаў харчавання. Сёння ў нас з прадпрыемства: фермы, комплексу, — не выйдзе дрэнная прадукцыя. Бо там яе адразу праверацъ і адбракуюць.

Па словах Прэзідэнта, раз у нас з Расіяй агульны рынак, то не трэба будаваць адзін для аднаго перашкоды. І калі мы перайшлі да механізму канкурэнцыі, то канкураваць трэба сумленна. У любым выпадку Беларусь за тое, каб паводзіць сябе па-партнёрску, дамаўляцца — галоўнае, на шчырай, сумленнай і прынцыповай аснове.

### БЕЛАРУСКІЯ ДАРОГІ Ў РАСТОВЕ

— З улікам прамысловага і інавацыйнага патэнцыялу Беларусі і Растоўскай вобласці нам трэба прапрацоўваць варыянты актывізацыі вытворча-кааперацыйных сувязяў, якія маюцца, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Перспектыўным бачыцца супрацоўніцтва ў будаўнічай сферы.

Так, тыя нашы арганізацыі, што маюць добры вопыт у сферы дарожнага будаўніцтва, а таксама праектавання і ўзвядзення жылля, інфраструктурных і сацыяльных аб'ектаў, зацікаўлены ва ўдзеле ў аналагічных праектах у Растоўскай вобласці.

— Мы можам таксама аказваць вам паслугі па дарожна-будаўнічай тэхніцы і праектаванні, будаўніцтве дарог, калі вам гэта будзе патрэбным, — звярнуў увагу кіраўнік краіны. — Мы гэта ўжо адпрацавалі, і вы можаце паглядзець сёння другую кальцавую дарогу, якую мы зрабілі вакол Мінска. Яна разлічана на перспектыву, зараз перахоплівае ўвесь транзіт, асабліва які ідзе з Берліна на Маскву. Вызвалілі першую кальцавую дарогу для ўнутраных патрэб, аўтамабільнага легкавога транспарту.

Асобнай тэмай для абмеркавання стала падрыхтоўка Растова да правядзення чэмпіяната свету па футболе ў 2018 годзе. Беларусі і тут ёсць, чым падзяліцца.

Васіль Голубеў пагадзіўся, што патэнцыял супрацоўніцтва ў Беларусі і Растоўскай вобласці велізарны. Па яго словах, пра гэта зараз кажа і бізнес.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# ХТО ПАВІНЕН АДКАЗАЦЬ ЗА ВЫКАРЫСТАННЕ АЎТАРСКАГА ТВОРА?

**...Падчас выязнога прыёму грамадзян у Вілейскім раёне да старшыні Мінаблвыканкама Сямёна ШАПІРЫ звярнуўся кіраўнік унітарнага прадпрыемства «Артыко», якое займаецца рэтрансляцыяй тэлевізійных каналаў у сетцы кабельнага тэлебачання. Два беларускія аўтары судзяцца з прадпрыемствам, паколькі лічаць, што арганізацыя не мае права выкарыстоўваць іх прадукт, і патрабуюць кампенсацыю за парушэнне выключнага аўтарскага права на яго ў памеры 13 тыс. рублёў.**

### Абавязак ператвараецца ў парушэнне

— На сваю дзейнасць мы маем дазвол Міністэрства сувязі і інфарматызацыі, — растлумачыў дырэктар Артур Шымакоўскі. — На рынку паслуг працуем больш як 20 гадоў, цалкам на самафінансаванні. Транслюем таксама сацыяльны пакет, куды ўваходзяць дзевяць праграм, у тым ліку і Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Беларусі. Паводле Закона аб сродках масавай інфармацыі, мы ў абавязковым парадку павінны гэта рабіць. Прадпрыемства наладзіла дзелавыя кантакты з Нацыянальным цэнтрам інтэлектуальнай уласнасці, асноўнай функцыяй якога з'яўляецца рэгуляванне адносін паміж аўтарамі, аператарамі сувязі і выканаўцамі. Прадпрыемства штомесяц пералічвае гэтай структуры 3% ад валавой выручкі, якая складае каля 16 тыс. рублёў. Разам з тым мы трапляем пад Закон аб аўтарскіх і сумежных правах.

Як правіла, суды задавальняюць прэтэнзіі аўтараў. Палова аператараў кабельных сетак Мінскай вобласці пацярпела ад аналагічных іскаў. Наогул, такая сітуацыя склалася ў цэлым па ўсёй краіне, адзначылі спецыялісты. Заяўнік папярэдне агучваў праблему старшыні Вілейскага райвыканкама Віктару Кату. Кіраўнік раёна добра разумее крыўду арганізацыі, але вырашэнне пытання не ў кампетэнцыі органаў мясцовай улады.

— Гэта вельмі сур'ёзны прабел у заканадаўстве, — лічыць Віктар Кот. — Мінаблвыканкаму варта звярнуцца з прапановай аб унясенні ў яго змяненняў.

Старшыня аблвыканкама даў даручэнне сфармуляваць грунтоўны дакумент для разгляду прэм'ер-міністру і ўпаўнаважанаму па абароне правоў спажыўцоў Мінскай вобласці.

### Выйграў не толькі прыватнік

Год назад абласныя ўлады дапамаглі вырашыць праблему вілейскага бізнесмена Дзмітрыя Цяліцына, які заключыў інвестыцыйны дагавор на ўзвядзенне турыстычнага комплексу каля Вілейскага вадасховішча. У працэсе будаўніцтва ўзнікла неабходнасць карэкціроўкі памераў адведзенага зямельнага ўчастка. Гэта пацягнула за сабой працэдуру пераафармлення, будаўніцтва прыпынілася. У выніку ўмовы дагавора былі парушаны, выкананне фінансавых абавязацельстваў па крэдыце стала немагчымым. Губернатар распарадзіўся прадоўжыць тэрмін інвестыцыйнага дагавора, каб давесці аб'ект да ладу.

— Праз некалькі месяцаў мы атрымалі дакументы на зямлю і літаральна на наступны дзень комплекс быў уведзены ў эксплуатацыю, — расказаў Дзмітрый Цяліцын працяг гісторыі. — Мінулы сезон мы панеслі страты, бо не вялі рэкламную кампанію, паколькі не ведалі, калі пачнём працаваць. З сёлетняга красавіка справы значна палепшыліся.

У пансіянаце «Кветкі яблыні» ўжо адпачывалі жыхары Расіі, Злучаных Штатаў Амерыкі, Польшчы, Беларусі. Даволі шмат месцаў забраніравалі грамадзяне Ізраіля, мяркуецца, што ў Вілейку прыедуць ірландцы, немцы. Адначасова турыстычны комплекс можа прыняць 52 чалавекі, у кожным доміку прадугледжаны гасцінічныя нумары: адна- і двухпакаёвыя, люкс.

Турыстычны комплекс размясціўся ў старым яблыневым садзе на ўскрайку сасновага бору, у месцы зліцця рэк Віліі і Сэрвачы. Гэта якраз пачатак Вілейскага вадасховішча. Замежнікаў прыцягваюць сюды маляўнічыя мясціны, чыстае паветра, цішыня.

— Мы супрацоўнічаем з музеем Першай сусветнай вайны ў Забароддзі, з вінзаводам у вёсцы Ілава Мядзельскага раёна, які выпускае цудоўны кальвадос з яблыкаў. Па смакавых якасцях напой, як я лічу, перасягае французскі. А каштуе як мінімум у пяць разоў менш. Адну групу звазілі туды на экскурсію з дэгустацыяй прадукцыі. Потым у аўтобус з цяжкасцю змясціліся напоі, якія турысты купілі на прадпрыемстве, — расказаў бізнесмен.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Больш за 82% расіян адабраюць дзейнасць Пуціна

Работу Дзмітрыя Мядзведзева станоўча ацэньвае 52,8% жыхароў краіны. Пра гэта сведчаць даныя апытання, праведзенага Усерасійскім цэнтрам вывучэння грамадскай думкі.

Паводле звестак сацыёлагаў, рэйтынг адабрэння дзейнасці прэзідэнта ў канцы красавіка складаў 81,6%. Апытанне, праведзенае ў першы тыдзень мая, паказала, што работу кіраўніка Расійскай Федэрацыі станоўча ацэньваюць ужо 82,1% расіян. Павысіўся і рэйтынг адабрэння дзейнасці Мядзведзева: з 52,1% у канцы красавіка да 52,8%. Узровень адабрэння дзейнасці кабінета міністраў пры гэтым нязначна знізіўся: калі ў канцы красавіка ён складаў 56%, то сярэдняе значэнне за перыяд з 30 красавіка па 7 мая склала 55,8%.

У рэйтынгу даверу палітыкам з вялікім адрывам ад астатніх па-ранейшаму лідзіруе Уладзімір Пуцін: за першы тыдзень мая паказчык вырас з 48,7% да 49,2%. Менавіта яго большасць рэспандэнтаў называюць, адказваючы на пытанне, каму б яны даверылі вырашэнне важных дзяржаўных пытанняў. У першую тройку рэйтынгу даверу таксама ўвайшоў міністр абароны Сяргей Шайгу (15,6%), які на 0,1% абагнаў прэм'ер-міністра Дзмітрыя Мядзведзева (15,5%). Лідарам «антырэйтынга» даверу застаецца Уладзімір Жырыноўскі.

### Белы дом: доказаў змовы каманды Трампа з Расіяй няма і быць не можа

У той жа час першы намеснік прэс-сакратара Белага дома Сара Хакабі-Сандэрс запэўніла, што прэзідэнт Трамп не мае



намеру перашкаджаць расследаванню сцвярджэнняў аб умяшанні Расіі ў ход амерыканскіх прэзідэнцкіх выбараў, якое вядуць міністэрства юстыцыі і камітэты абедзвюх палат Кангрэса.

«На самай справе мы заахвочваем завяршэнне імі гэтага расследавання, каб пакончыць з гэтым і перакананца ў тым, пра што мы гаворым ужо амаль год: няма ніякіх доказаў змовы паміж выбарчым штабам Трампа і Расіяй», — сказала Хакабі-Сандэрс.

Апазіцыйная Дэмакратычная партыя і блізкія да яе амерыканскія СМІ ўпарта імкнуцца раздзімаць скандал вакол прыпісваемага Маскве ўмяшання ў перадвыбарчыя працэсы ў ЗША на баку Трампа. І сам гаспадар Белага дома, і Расія рашуча адпрэчваюць гэта.

### НАТА не збіраецца ўдзельнічаць у баявых дзеяннях у Сірыі і Іраку

Паўночнаатлантычны альянс не будзе ўдзельнічаць непасрэдна ў баявых дзеяннях супраць тэрарыстычнай групоўкі «Ісламская дзяржава» ў Сірыі і Іраку. Пра гэта заявіў у Берліне генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг па выніках перамоваў з канцлерам ФРГ Ангелай Меркель.

«Нават з уваходжаннем НАТА ў кааліцыю яе роля не зменіцца, альянс не будзе ўдзельнічаць у баявых дзеяннях у Сірыі і Іраку», — сказаў ён.

Цяпер НАТА дае разведвальную інфармацыю па сітуацыі ў рэгіёне і навучае іракскія сілы бяспекі.

### Вырашаць праблемы па тэлефоне

**У гэтую суботу, 13 мая, прамыя тэлефонныя лініі з насельніцтвам традыцыйна пройдуць ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Такія зносіны доўжацца ўжо не першы год, чыноўнікі гатовы хутка і кампетэнтна адказаць на пытанні беларусаў і вырашыць праблемы, з якімі не атрымліваецца разабрацца самастойна.**

З 9.00 да 12.00 на званкі адкажуць:

**Брэсцкі аблвыканкам**
старшыня Савета дэпутатаў АШМЯНЦАЎ Сяргей Дзмітрыевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПЕНІН Уладзімір Пятровіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні МІКАЛУЦКІ Аляксандр Віктаравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
старшыня Савета дэпутатаў ЖУК Ігар Георгіевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ХАРЫТОНЧЫК Дзмітрый Іванавіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПЛАЎСКІ Алег Альфрэдавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
старшыня ШОРАЦ Андрэй Віктаравіч (80172224444).

# ІНВЕСТЫЦЫІ Ў БУДУЧЫНЮ

**У Віцебску адкрыліся VI Міжнародны эканамічны форум «Інавацыі. Інвестыцыі. Перспектывы» і XIV Рэспубліканскі экалагічны форум.**



Фота Надзеі БУЖАН.

**Міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА азнаёміўся з прадстаўленымі на спецыялізаванай выставе тэхналогіямі выкарыстання другасных рэсурсаў і ўзнаўляльных крыніц энергіі.**

Эканамічны форум стаў цэнтральнай інвестыцыйнай пляцоўкай для сустрэч і абмену вопытам прадстаўнікоў бізнесу розных краін, вядучых экспертаў у сферы паляпшэння інвестыцыйнага і дзелавога клімату.

Падчас наведвання спецыялізаванай выставы госці мерапрыемства і жыхары Віцебска змаглі пазнаёміцца з дасягненнямі навукі і тэхнікі, тэхналагічным патэнцыялам Віцебскай вобласці ў сферы будаўніцтва, энергетыкі, энерга- і рэсурсазберажэння, а таксама новымі «зялёнымі» тэхналогіямі, якія сёння выкарыстоўваюцца на прадпрыемствах Беларусі.

Па словах старшыні Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Мікалая Шарстнёва, Віцебшчына мае значны інвестыцыйны патэнцыял. Толькі сёлета ў рэгіёне рэалізуецца больш за 180 інвестыцыйных дагавораў, заключаных бізнесменамі з розных краін свету з аблвыканкамам на суму каля 1,2 млрд долараў.

У мерапрыемствах форумаў таксама прымалі ўдзел дэлегацыі з Расійскай Федэрацыі, Латвіі, Германіі, Польшчы, Славакіі, Турцыі, Кітая і інш.

— Аб'яднанне экалагічнага і эканамічнага форумаў мне падаецца вельмі важным і сімвалічным, бо развіццё эканомікі цяпер магчыма на аснове экалагічных падыходаў да дзейнасці прадпрыемстваў, да аховы навакольнага асяроддзя, — адзначыў **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй КАЎХУТА.** — Гэта таксама неабходна для стварэння спрыяльных умоў для жыцця нашых грамадзян і павелічэння іх дабрабыту.

**Вераніка КОЛАСАВА.**

■ Надвор'е

# МАЙСКІ СНЕГ



Фота БЕЛТА.

## Сіноптыкі прагназуюць, што цяплец пачне ў нядзелю, калі на поўдні чакаецца да плюс 20 градусаў

**Першая дэкада мая сапраўды выдалася ў нас даволі халоднай. А ў апошнія некалькі дзён у многіх раёнах Беларусі назіраўся нават мокры снег. У выхадныя надвор'е крыху супакоіцца і пацяплее, але тэмпература паветра застанецца яшчэ ніжэй за кліматычную норму, паведамляе начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Разам з тым спецыяліст адзначыў, што вялікага цяпла ў хуткім часе па-ранейшаму чакаць не варта. У пятніцу будзе пераважна без ападкаў, толькі ўдзень па Брэсцкай вобласці чакаецца кароткачасовы дождж. Максімальная тэмпература паветра складзе 10—18 цяпла. Халодна будзе і ў суботу, калі, пераважна па паўднёвай частцы краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе 1—8 цяпла, аднак па паўночным усходзе чакаецца яшчэ ад нуля да мінус 3 градусаў. Удзень — ад плюс 8 да плюс 15 градусаў. Больш сонечна і цёпла стане ў нядзелю, калі будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 6 градусаў, па паўднёвым усходзе — да 8 цяпла. Удзень прыгрэе да 12—19 цяпла, а па поўдні чакаецца нават да плюс 20 градусаў.

Цяпер некалькі лічбаў. Адмоўны тэмпературны рэкорд дня быў пабіты сёлета ў Гомелі ўначы 11 мая, калі тэмпература апускалася да мінус 0,6 градуса. Спецыялісты адзначаюць, што ў апошнія некалькі сутак на тэрыторыі Беларусі назіралася анамальна халоднае надвор'е з тэмпературным фонам па краіне на 8—11 градусаў ніжэй за кліматычную норму. Сярэднясутачная тэмпература была ў межах ад плюс 1 да плюс 4 градусаў. Сіноптыкі нагадваюць, што тэмпературны максімум для 12 мая назіраўся ў 2013 годзе, калі было зафіксавана плюс 27 градусаў. Мінула толькі чатыры гады і што... Няўжо глабальнае пацяпленне ўжо скончылася?

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Актуальна

# ЖЫЦЦЁ ДЫКТУЕ ПРАВІЛЫ

**Сёння стануць вядомыя пераможцы XIII Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу «Тэлевяршыня».**

Трансляцыю цырымоніі ўзнагароджвання можна будзе пабачыць у 21.05 у эфіры тэлеканала АНТ. Як расказаў **намеснік міністра інфармацыі Уладзімір РАБАВОЛАЎ,** сёлета на конкурс было пададзена 286 заявак ад 101 тэлевяшчальнага СМІ. Пераможцы будуць вызначаныя ў 25 намінацыях, чакаюцца і спецыяльныя прызы.

Узровень айчыннага тэлебачання зараз надзвычай высокі, яно адпавядае ўсім трэндам сусветнага вяшчання. Гэта падкрэсліў **загадчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання Інстытута журналістыкі БДУ Вячаслаў БУЛАЦКІ.** Ён зазначыў, што якасна працуюць не толькі каналы нацыянальнага вяшчання, але і рэгіянальныя. Сёлета выдатныя вынікі можна адзначыць у дзіцячым і юнацкім сегментах тэлепраграм, таксама шмат матэрыялаў было прадстаўлена на конкурс у культурна-асветніцкай галіне.

Як падкрэсліла **кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры рэжысуры кіно і тэлебачання факультэта экранных мастацтваў БДАМ Галіна ЗЛАБЕНКА,** наша тэлебачанне сапраўды ўздымае многа глабальных тэм, якасна працуюць рэгіянальныя тэлекампаніі, асабліва яркія праграмы прадстаўляюць Магілёў, Паставы, Ліда, Шклоў. Але ёсць і недахопы. На думку Галіны Пятроўны, сёння на тэлебачанні не стае партрэтаў знакавых асоб, а такія праграмы былі б больш блізкія гледачу.

Арганізатары абяцаюць, што цырымонія ўзнагароджвання пераможцаў XIII Нацыянальнага конкурсу «Тэлевяршыня» будзе яркай і дынамічнай, у якасці вядучых выступяць супрацоўнікі розных айчынных тэлеканалаў.

Карэспандэнты «Звязды» будуць сачыць за ходам цырымоніі, якая пройдзе сёння ў Палацы Рэспублікі. Рэпартаж з закулісся чытайце і глядзіце на нашым сайце.

**Марына ВЕСЯЛУХА.** *vesialuha@zviazda.by*

■ Прававая дапамога

# Натарыус для ветэрана

## бясплатна і з выездам дахаты

**Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны 91-гадовая Ніна Бітус атрымала дапамогу натарыуса, не выходзячы з дому. Спецыялісты прыехалі да яе, растлумачылі акалічнасці пытання жанчыны і на месцы засведчылі натарыяльную даверанасць. Усё гэта было зроблена бясплатна ў межах акцыі, арганізаванай Міністэрствам юстыцыі да 72-й гадавіны Перамогі ў ВАв.**

Бязвыплатныя кансультацыі вопытных юрыстаў, адвакатаў і натарыусаў атрымалі дома і іншыя ветэраны, якія звярнуліся па дапамогу да супрацоўнікаў міністэрства. Астатнія грамадзяне вырашалі свае пытанні непасрэдна ў Мінюсце. Падчас леташняй акцыі, дарэчы, спецыялісты дапамаглі больш як 300 асобам па ўсёй рэспубліцы, а сёлета толькі ў сталіцы вырашылі свае праблемы звыш 100 чалавек.

— Людзі перш за ўсё звяртаюцца да нас з пытаннямі, якія датычацца працоўнага, сямейна-шлюбнага і грамадзянскага кодэксаў, а таксама прымусовага выканання судовых пастаноў і іншых дакументаў, — расказаў **намеснік міністра юстыцыі Мікалай СТАРАВОЙТАЎ.** — Мінулы год паказаў, што такая акцыя настолькі запатрабавана насельніцтвам, што мы выходзім за межы адведзенага на яе часу. Прыняць усіх ахвотных за запланаваныя дзве гадзіны мы не паспяваем, таму працуем больш. Стараемся зрабіць так, каб кожны чалавек пайшоў ад нас з разуменнем, што ён атрымаў дапамогу, якая яму была неабходна.



**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Віншуем!

# Талент заўсёды запатрабаваны



**Старшыню Беларускага саюза журналістаў Анатоля ЛЕМЯШОНКА віншуем з прыгожай датай — 70-годдзем!**

У сваіх размовах і інтэрв'ю з калегамі ён заўсёды падкрэслівае, што галоўнае ў журналістыцы — прафесіяналізм, і што газетчыкам не трэба баяцца наступлення інтэрнэт-рэсурсаў, а працягваць працаваць крэатыўна, шукаць новыя формы работы, бо талент заўсёды запатрабаваны. Важна аваладаць мастацтвам супастаўляць факты, заўважаць і тое, што злева-справа, а не толькі тое, што перад табой, адзначае спадар Лемяшонак. А ён ведае, пра што кажа. Працаваў Анатоль Іванавіч у свой час у газетах «Во славу Родины», «Советская Белоруссия», «Семь дней», нарэшце, у «Рэспубліцы». Шмат гадоў узначальвае Беларускі саюз журналістаў. Не сакрэт, што ў рабоце ён строгі, ды справядлівы, пунктуальны, чаго заўсёды патрабаваў ад навакольных. А вось дома трымаецца, паводле яго прызнання, прынцыпу дэмакратыі — усе члены сям'і самастойна прымаюць рашэнні, хоць звычайна любяць параіцца адзін з адным. Нездарма ў адной важкай нагоды сам Анатоль Іванавіч пажадаў журналістам дзвюх галоўных рэчаў: стойкасці і здароўя, маўляў, без іх немагчыма стаць на ногі, пачаць рухацца наперад. Што ж, калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» таксама зычыць юбіляру гэтых дзвюх важных рэчаў. Рухайцеся наперад, адкрывайце новыя магчымасці для членаў Беларускага саюза журналістаў, заахвочвайце маладых і не губляйце з поля зроку тых, хто працягвае плыць побач з вамі па Рацэ Часу!

**Звяздоўцы**

## Адкрываецца паляванне

З 15 мая ў паляўнічых гаспадарках краіны адкрыецца сезон палявання на дарослых самцоў казулі, а таксама селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту. Згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, здабываць трафеі можна будзе па 30 верасня, цягам сутак. Спосаб палявання — зброевы з засады, з падыходу. Дазволеныя прылады палявання — нарэзная паляўнічая зброя з дульнай энергіяй кулі звыш 1500 джоўляў, гладкаствольная паляўнічая зброя з патронамі з куляй ці карцеччу, паляўнічыя лукі і арбалеты.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Витязь», 210605, Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, 8 (0212) 57-85-08

**Лот №1.** Капитальное строение с инв. №200/С-72650 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, д. 13А/37, площадью 488 кв. м, наименование: производственный корпус №28 (площадка 1), назначение: здание неустановленного назначения, расположенное на зем. участке с кадастровым №240100000003000095 площадью 25,6294 га (долевая аренда). Нач. цена: 210 000 руб. без НДС. Задаток: 21 000 руб.

Аукцион состоится 14.06.2017 в 11.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 12.05.2017 с 8.30 по 13.06.2017 до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Витязь», 210605, Витебская обл., г. Витебск, ул. П. Бровки, 13а, 8 (0212) 57-85-08

**Лот №1.** Капитальное строение с инв. №200/С-72707 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Петруся Бровки, 13А/40, площадью 2 505 кв. м, наименование: административно-бытовой корпус 20 «Кисловодск-4», назначение: здание административно-хозяйственное, расположенное на зем. участке с кадастровым №240100000003000095 площадью 25,6294 га (долевая аренда). Нач. цена: 836 000 руб. без НДС. Задаток: 83 600 руб.

Повторный аукцион состоится 14.06.2017 в 11.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 12.05.2017 с 8.30 по 13.06.2017 до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона, оплата за объект производится в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи. Условие аукциона: возмещение затрат по оценке имущества, оплата НДС сверх цены продажи объекта. Ранее опубликованные извещения: газета «Звязда» 08.10.2016, 24.01.2017, 03.04.2017

**Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем РБ – копия документа, подтверждающего гос. регистрацию юр. лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр. лица – документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010 ЗАО «МТБанк», БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП «Витебский областной центр маркетинга».** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел.: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

# ВІНТАЖ ПА-ГРОДЗЕНСКУ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Уздоўж прылаўка чутно: «Колькі каштуе?», «А гэта па чым?». Цікаўлюся, як фарміруецца цана на тавар.

— А ніяк, — чую ад мужчыны збоку, — мы прапануем сваю цану, пакупнік — сваю, затым знаходзім кампраміс. Напрыклад, за насценны гадзіннік я прасіў 420 рублёў, а прадаў за 380. Праўда, муж з жонкай падыходзілі да мяне некалькі разоў.

Вось і зараз адну з пакупніц зацікавіў стары гадзіннік, але ўжо настольны. Кажа, што прымеркавала яго для каміна. Прадавец запрасіў 400 рублёў. Жанчына напрыканцы звярнула ўвагу на вялізнае яйка-шкатулку і адышла.

Пакупнікі ўважліва разглядалі прылаўкі. Чаго толькі тут няма. Посуд, самавар, патэфон, гаспадарчыя прылады, бутлі, не кажучы пра розныя значкі, маркі, манеты... За серп прасілі 4—5 рублёў, за падковы — 2—8, барэльефы гіпсавых анёлаў у пазалочаных рамках каштавалі 50, срэбны набор кубачкаў — 40, за статуэтку дамы ў пікантнай позе прасілі 20 рублёў. Ёсць версія, што ў ёй можна схаваць што-небудзь.

— Ніколі не ведаеш, што можна набыць разам з прадметам даўніны. Мой знаёмы аднойчы купіў шкатулку, а там у патайным аддзеле — каштоўны пярсцёнак, — падзяліўся камерцыйным поспехам сябра прадавец Дзмітрый.

Сам ён таксама аматар старых рэчаў. Пры выпадку купляе іх і за межамі краіны. Нешта прывёз і на гродзенскі рынак, напрыклад, вось гэтую прыгожую французскую лямпу пад газу. Гаворыць, што ў Еўропе, і ў Расіі такія блышыныя рынкі вельмі папулярныя. Яны там праводзяцца рэгулярна і збіраюць вялікія натоўпы як прадаўцоў, так і пакупнікоў. Дарэчы, на барахолцы ў Гродне сустракаліся польскія турысты. Яны цікавіліся самаварам і польскімі медалямі.

Многія жанчыны-наведвальніцы, як ні дзіўна, звярталі ўвагу на маркі і манеты. Аказваецца, яны раней таксама захапляліся філатэліяй і нумізматыкай, і зараз успомнілі маладыя гады.

— Прыйшла сюды з пазнавальнай мэтай, — паведаміла гродзенка, — раней і сама маркі збірала. І рэчаў такіх было нямала, але з пераездамі пагубляліся. Вось ваза ва ўсходнім стылі нагадала мне Каўказ, дзе я вучылася, і разам з гэтым юнацтва...

і захаваць яго ў сабе, — адзначыў Леанід Міхайлавіч. — Успаміны хочуць вярнуць, настальгіруюць...

Куплялі ў асноўным тое, што не вельмі дорага. Напрыклад, мужчына з барадой набыў два старыя фотаздымкі за 8 рублёў.

— Навошта яны вам, — пытаю, — гэта ж нават не вашыя продкі ці вядомыя людзі... не разумею...

— Таму, што вы жанчына практычная, а жыць — гэта не толькі дзяцей нараджаць



Леанід Міхайлавіч, былы інжынер, а цяпер калекцыянер і прадавец, лічыць, што многія ідуць сюды, каб набыць рэчы, якія некалі былі ў іх, а зараз з'яўляюцца рэдкасцю. Іх яшчэ называюць вінтажнымі — гэта брэнды мінулых гадоў. Больш старыя рэчы, якім за паўстагоддзя, адносяцца да катэгорыі антыкварных. На рынку такіх таксама нямала.

— Многія мелі такія прадметы і цяпер хочуць набыць іх, каб вярнуцца ў той час, успомніць нешта прыемнае і піць-есці, мы вышэй за гэта, цікавімся гісторыяй, у музеі ходзім, — кінуў мужчына адыходзячы.

Прызнаюся, позірк больш выхопліваў бытавыя рэчы, чым тыя ж вінілавыя пласцінкі (радыёлы ж няма) ці розныя значкі (куды іх чапляць?). Што ў іх каштоўнага? Але пачула, як калекцыянер пахваліўся, што мае значок, за які яму прапаноўваюць 900 долараў.

— Я яго не прадаю, бо гэта рэдкасць, дэсантны значок, выпушчаны малым тыражом, — паведаміў Алег Юр'евіч.

На рынак ён прынёс частку сваёй калекцыі, якую збірае амаль 40 гадоў, яшчэ з арміі. Алег дэманструе медаль 1934 года, які выдаваўся па будаўніцтве алімпійскіх аб'ектаў у Германіі. А вось свісток для падняцця ў бой салдат рускага імператарскага палка. Кажа, што моладзь цікавіцца такімі прадметамі.

Мяне ж больш чапляла гісторыя Гродна, старыя паштоўкі з выявамі старога горада. І такія знайшліся. У аднаго прадаўца цана — ад 30 да 300 рублёў. У другога — больш роўная: 40—50 рублёў.

Уразіў здымак гэтай самай плошчы 1944 года, адразу пасля вызвалення. Там, дзе размясціўся рынак, была зруйнаваная зямля, але затое стаяў старажытны храм Фара Вітаўта, які знеслі праз 15 гадоў. Цяпер на гэтым месцы памятны знак. Паштоўка 1918 года адлюстроўвае від гарадской плошчы з абеліскам, якога таксама цяпер няма. Старыя фота і паштоўкі можна аформіць у рамку і падараваць з якойнебудзь нагоды.

— Кірмаш даўніны, спадзяюся, прыцягне і замежных турыстаў, гэта будзе і надалей такая «фішка» для бязвізавага горада, — паведаміў адзін з арганізатараў, **старшыня гродзенскага таварыства нумізматаў «Скарабей» Віктар КАКАРЭКА.** — У нас ёсць цікавыя калекцыі і рэчы на продаж, людзі пагладзяць, успомняць нешта і купяць.

У невялічкай таўханіне заўважаю інтэлігентнага мужчыну з вялізнай статуэткай. Нейкая антычная дама амаль з паўметра. Свой здабытак мужчына вызначыў як артэфакт другой паловы XX стагоддзя.

— Хутчэй за ўсё, статуя зроблена ў 60-я гады і штучна састарана. Будзе стаяць для ўпрыгожвання інтэр'ера, гэта цяпер модна...

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*



## Стартавала акцыя «Не пакідайце дзяцей адных!»

**У сталіцы пачалася рэспубліканская прафілактычная акцыя «Не пакідайце дзяцей адных!» Яна праводзіцца з мэтай прыцягнення ўвагі да праблемы дзіцячага свавольства з агнём і гібелі дзяцей на пажарах, зніжэння колькасці надзвычайных сітуацый з удзелам дзяцей і гарантавання іх бяспекі дома, на вуліцы, адпачынку, вадаёме і г. д.**




Акцыя «Не пакідайце дзяцей адных!» пройдзе ў тры этапы. На першым мерапрыемствы адбудуцца ў шматдзетных сем'ях і дзіцячых дамах сямейнага тыпу, у дзіцячых забаўляльных цэнтрах і арганізацыях грамадскага харчавання. Гэтыя мерапрыемствы пройдуць з 12 па 15 мая і будуць прымеркаваны да Міжнароднага дня сям'і.

Другі этап акцыі пройдзе з 16 па 30 мая. Ён адбудзецца ва ўстановах аховы здароў'я і адукацыі, цэнтрах пазашкольнай адукацыі, дашкольных установах і пачатковых класах агульнаадукацыйных устаноў. А трэці этап пройдзе 31 мая. Вялікае шоу з дэманстрацыяй пажарнай аварыйна-выратавальнай тэхнікі адбудзецца на пляцоўцы перад Мінскім дзяржаўным палацам дзяцей і моладзі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# НЕ ПАНАЦЭЯ, А АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ ДАПАМОГА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Спрэчкі ў іншых сферах таксама вырашальныя праз медыяцыю, упэўнены спецыялісты:

— Медыяцыя — усёпранікальная з'ява, і наша дзяржава і грамадскасць могуць карыстацца гэтай альтэрнатывай на карысць усіх. Мы заахвочвалі дэпутатаў вучыцца на медыятараў, каб яны пранікнуліся тым, як працуе гэты механізм, і сталі яго рэалізатарамі, — расказаў **Віктар КАМЯНКОЎ, дырэктар вучэбна-практычнай установы (далей — ВПУ) «Цэнтр «Медыяцыя і права».** — Ва ўмовах аптымізацыі дзяржапарату частку функцый па вырашэнні праблем можна перадаць медыятарам, якія па-іншаму, з новым поглядам падыдуць да разгляду канфліктаў. Працоўныя адносіны, напрыклад, абавязкова трэба разглядаць праз медыяцыю. Можна ўключаць у яе і банкруцтва, і палітычныя, і канфесійныя пытанні.

## СЯМ'Я ЗАЎЖДЫ Ў КРЫЗІСЕ?

Сям'я — самы медыяцыйны асяродак, дзе дамаўляцца прыходзіцца пастаянна. Сямейная медыяцыя развіваецца ў Беларусі са снежня 2014 года, як толькі пачалося першае навучанне медыятараў.

— З першага ж дня мы развіваем адразу два кірункі: дадатковае навучанне медыятараў рабоце з сям'ёй і будаванне іх адносін з іншымі спецыялістамі: тэрапеўтамі, адвакатамі, натарыяльнымі канторамі, каб аказваць сужэнцам максімальна поўную паслугу, — расказаў **Андрэй ЗДРОК, кіраўнік праекта «Сямейная медыяцыя» ВПУ «Цэнтр «Медыяцыя і права».** — Усё больш людзей ведаюць, што такое медыяцыя, аднак часта яны не вераць, што менавіта іх праблему можна вырашыць з яе дапамогай. Неабходна выкарыстоўваць нейкія новыя інструменты, каб пераканаць грамадзян, што медыяцыя здольная прынесці вынік. Дзеля гэтага, напрыклад, можна рабіць першую сесію (сустрэчу) з медыятарам бясплатнай.

Да ўзнікнення разнастайных канфліктаў паміж людзьмі прыводзіць адсутнасць культуры дыялогу паміж імі, што робіць немагчымым паразуменне.

— Медыяцыя прывучае людзей, што ўступаць у дыялог можна па розных праблемах, у тым ліку і па сямейных. І тут важна, каб людзі выслухалі адно аднаго, высветлілі, што ім перашкаджае, і да нечага дамовіліся, — упэўнены **Рустэм МАКСУДАЎ, прэзідэнт Цэнтра «Судова-правая рэформа» (Расія).** — Сямейная медыяцыя вельмі важная, бо сёння гэта канфлікт адной сям'і, а заўтра ён звязаны з праблемай наркаманіі і правапарушэннямі. Калі не слухаць дзяцей, адбываецца працэс выкідвання іх з сям'і. А ў многіх выпадках гэтага можна пазбегнуць, калі б існаваў дыялог бацькоў і дзіцяці. Школа — таксама рэсурс медыяцыі пры наладжванні зносін паміж настаўнікамі, бацькамі, вучнямі.

Экамедыяцыя — найлепшы варыянт пры разглядзе сямейных пытанняў, і яе можна пакласці ў аснову нацыянальнай мадэлі развіцця медыяцыі, лічыць **Аксана ЗДРОК, трэнер ВПУ «Цэнтр «Медыяцыя і права»:**

— Спецыфіка экамедыяцыі ў тым, што мы выпрацоўваем пагадненне з улікам патрэбаў не толькі канфліктуючых бакоў (як правіла, бацькоў), а і ўсіх членаў сям'і. Такім чынам медыяцыя вядзецца не з двума людзьмі, а з цэлай сямейнай сістэмай. Сям'я — тое, што пастаянна развіваецца, і яна заўжды перажывае крызісы. Першы год пасля шлюбу, калі людзі прыцiраюцца адно да аднаго, пасля нараджэння дзіцяці, якое перацягвае на сябе ўвагу, падлеткавы ўзрост малых і іншыя перыяды.

## ДОБРААХВОТНАЯ АБАВЯЗКОВАСЦЬ

Добраахвотная медыяцыя па сямейных пытаннях павінна быць абавязковай, упэўнены медыятары. Супярэчлівасць такой пастановкі яны тлумачаць тым, што людзі могуць выбраць медыятара самастойна, аднак ім абавязкова трэба схадзіць да яго, перш чым судзіцца. Такія сустрэчы зарыентуюць канфліктуючых, чаго ім чакаць у судзе і як паводзіць сябе далей адно з адным і са сваімі дзецьмі.

— У адрозненне ад астатніх сродкаў урэгулявання канфліктаў медыяцыя скіравана на будучае і захаванне нармальных адносін, якія складуцца пасля разводу. І гэта першасная задача, а не захаванне сям'і, — адзначыў **Іван ХУРС, дырэктар Гродзенскага філіяла ВПУ «Цэнтр «Медыяцыя і права».** — Часцей за ўсё мне кажуць, што пасля разводу муж і жонка больш ніколі не пабачацца. Тады я тлумачу, што ім усё роўна прыйдзецца мець стасункі ў будучым і дамаўляцца. Думаць пра агульных дзяцей, іх адукацыю, пра маёмасць, якую часцей за ўсё не так проста падзяліць адразу, бо яна набытая ў крэдыт. Тры месяцы, што даюцца судом на развагі перад разводам справы аб скасаванні шлюбу, нічога не дадуць, калі сужэнцам ніхто не дапаможа.

— Дакумент, які мы павінны прыняць, будзе працаваць перш за ўсё на карысць чалавека, — падкрэсліла **Наталля ГУЙВІК, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па заканадаўстве.** — Мы хочам на заканадаўчым узроўні даць бакам магчымасць абавязковай інфармацыйнай кансультацыі, каб яны даведаліся, што гэта, і атрымалі вынік. І суды не будуць прымаць іскавую заяву і не пачнуць па ёй працэс, пакуль не будзе паперы аб дасудовым звароце да медыятара: медыяцыйнага пагаднення або заключэння аб спыненні медыяцыі.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

**ТРАДЫЦЫЙНА 6 мая нашы продкі ўшаноўвалі святога Юр'я. Выходзілі ў поле, дзе ўжо рунела жыта, умываліся расою, прыносілі дарункі святому заступніку нівы і свойскіх жывёл, выганялі ў поле кароў, коней, коз, танцавалі, вадзілі карагоды, спявалі і частаваліся рытуальнай стравай — яечняй. Гэтае свята мае глыбокія міфалагічныя карані, яно азначала сапраўдны пачатак вясны. Юраўская сімволіка і сёння не да канца вывучаная даследчыкамі фальклору, не ўсе сакрэты разгаданыя, а таму нам яшчэ цікавей назіраць за правядзеннем абраду, у кожным з рэгіёнаў краіны — адметнага.**

ЗВЯЗДА
Наперад у мінулае
3
Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# «Карагод вялікі — вуліца малая»

## ЮР'Я, УСТАНЬ РАНА, УМЫЙСЯ БЕЛА...


Баба Каця рашчыняе цеста для карагода.

На працягу мая аматары праграмы «Наперад у мінулае», што выходзіць у эфіры тэлеканала «Беларусь 3», будуць віртуальнымі ўдзельнікамі свята Юр'я, пабачаць, як яго адзначалі і адзначаюць на Гродзеншчыне, Магілёўшчыне і Гомельшчыне. Так, у вёсцы Беліца, што на Лідчыне, усе ўжо мелі магчымасць пабываць у мінулую нядзелю, 14 мая завітаем у Пагост на Жыткавіччыну, дзе абрад «Юраўскі карагод» захаваўся ў жывым бытаванні, а 21-га выправімся на Асіповіччыну, у Вяззе. Як заўсёды, разам са здымачнай камандай праекта «Наперад у мінулае» вандравала і наш карэспандэнт. Таму чытачам «Звязды» мы ўжо расказваем, як усё было.

### На поле — моўчкі, з поля — спяваючы

Рыхтавацца да свята ў Пагосце на Жыткавіччыне пачынаюць яшчэ 5 мая. Гаспадыня Кацярына Панчэня, або, як кажуць вяскоўцы, баба Каця, вось ужо на працягу 40 гадоў рашчыняе цеста для святочнага карагода — так тут называюць каравай, які выпякаюць на Юр'я. Гаспадыня растлумачыла адметнасці прыгатавання рытуальнай стравы.

**«Юраўскі карагод» ладзілі ў Пагосце нават падчас Вялікай Айчыннай вайны.**

— Калі пякуць вясельны каравай, то лічыцца, што падчас замешвання цеста ўсё трэба рабіць па адным разе: адзін раз дадаваць яйкі, муку, алей, уліваць малако. Каб гэты каравай быў адзіным вясельным у лёсе маладых. Калі ж рыхтуем цеста для карагода, то наадварот — каб быў багаты ўраджай, і муку, і яйкі, і малако ў цеста дадаём як мага больш разоў. Сыплючы муку, у думках кажам пажаданні, каб радзіла жыта, быў добры ўраджай. Карагод можа выпякаць любая жанчына, якая не лянуецца, няважна, ці яна ўдава, ці разведзеная.

Дарэчы, упрыгожваюць карагод толькі каласкамі, вылепленымі з цеста. Гэта знак наступнага ўраджаю. А калі пірог ставяць у печ, нікому нельга ні заходзіць у хату, ні выходзіць з яе: кажуць, што гэта прыкмета беднага года. І баба Каця лічыць, што старажытнаму забабону можна верыць: «Старыя людзі не былі дурныя».

Ужо ранняй раніцай 6 мая, калі на полі яшчэ ляжыць раса, жанчыны збіраюцца ў хаце Кацярыны Панчэні. Тут усе разам упрыгожваюць святочны карагод, рыхтуюцца святкаваць Юр'я ўсёй вёскай. Дарэчы, справа выпякання і ўпрыгожвання каравая — выключна жаночая.

— Мужчыны таксама прымаюць удзел у абрадзе, але ў іх іншыя заняткі: несці ікону, граблі, звязду, карагод. Мужыкі ў цеста ніколі не лезлі, — кажа баба Каця.

Сам абрад пачынаецца яшчэ ў хаце, першыя словы кажа гаспадыня:

— Давайце пачнём абрад, каб ён нам прынёс добры ўраджай. Гэтае свята ідзе ад дзядоў па нашай спадчыне, штогод тут робяць карагод, каб жыта ўрадзіла.


На абрад у полі ўсе ўдзельнікі праходзяць праз «брамку», зробленую з ручніка.

А падчас упрыгожвання каравая спяваюць такую песню:

*Карагод-карагод, мы цябе наражаем,*
*Ой, венцы-венцы, зялёны бярвенцы.*
*Цябе наражаем, Бога праслаўляем,*
*Ой, венцы-венцы, зялёны бярвенцы.*
*Бога праслаўляем, Юр'я прывячаем.*
*Ой, венцы-венцы, зялёны бярвенцы.*

Перад тым як выйсці з хаты, карагод тры разы ўздымаюць угору, просяць у Бога дапамогі, бо «без Бога — ні да парога». Пасля грамадой удзельнікі абраду ідуць у поле. Дарэчы, ідучы на святкаванне, усе маўчаць. Першымі ў шэсці рухаюцца дзяўчаты, якія нясуць «браму», складзеную з ручніка, за імі — хлопцы з зоркай і іконай, мужчына з упрыгожаным карагодам, музыкант. Таксама ў шэсці нясуць граблі. Калі толькі ідуць на поле, на граблі чапляюць фартух зялёнага колеру, што сімвалізуе цнатлівасць, падрыхтоўку да наступнага ўраджаю. Ужо ў полі, пасля таго як будуць сказаныя рытуальныя словы, паводзяць карагоды, зялёны фартух на граблях заменяць на чырвоны, ён стане сімвалам урадлівасці глебы і новага добрага ўраджаю.

**«Калі рыхтуем цеста для карагода, то — каб быў багаты ўраджай — і муку, і яйкі, і малако ў цеста дадаём як мага больш разоў. Сыплючы муку, у думках кажам пажаданні».**

**«Мужчыны таксама прымаюць удзел у абрадзе, але ў іх свае заняткі — несці ікону, граблі, звязду, карагод».**

На полі спяваюць такую песню:

*...Ведом, ведом корогод — сам Бог наперод!*
*А ў корогода сын воевода.*
*А ў коромыслі добрые мыслі.*
*Дзе корогод ходзіць — там жыто родзіць,*
*А дзе не бывае — там жыто не мае.*
*Зарадзі, Божэ, жыто да на новае лето,*
*Да на жыто на пшэніцу,*
*Да на ўсяку пашніцу...*

А рытуальныя словы гучаць наступным чынам: «Юр'я, устань рана, умыйся бела. Прычашыся, прыбярыся, бяры ключы, ідзі ў стайню, сядлай каня, едзь у поле, адмыкай зямліцу, пускай расіцу. У гаду два Юр'і, абодва дурні. Адзін — халодны, другі — галодны».

Сыходзяць з поля, як і заходзілі, праз браму-ручнік. Усе ўдзельнікі абраду рухаюцца па вёсцы ўжо з песнямі. Тут гучаць не толькі абрадавыя, але і пазаабрадавыя, жартоўныя спевы. Спыняецца вясёлая грамада каля кожнай хаты, дзе водзяць карагоды, віншуюць з Юр'ем аднавяскоўцаў, жадаюць добрага ўраджаю і здароўя на ўвесь год. А тыя, каго павіншавалі, адорваюць удзельнікаў абраду пачастункамі. Гэта звычайна яйкі, хлеб ці пірог, цукеркі, гарэлка або проста грошы. Святкаванне заканчваецца агульным вялікім застоллем з пачастункамі. Тут да вечара спяваюць песні, танцуюць танцы, частуюцца смачнымі каравамі.

Дарэчы, як расказаў нам мясцовы жыхар Іван Зохна, Юраўскі карагод святкавалі ў Пагосце нават падчас Вялікай Айчыннай вайны: «Ну, а як яго не праводзіць, гэта ж свята». І сёння ў абрадзе ўдзельнічаюць не толькі старэйшыя жыхары вёскі, але і моладзь, школьнікі.

Гэты варыянт святкавання Юр'я ўжо больш як дзесяцігоддзе ўваходзіць у спіс нематэрыяльных каштоўнасцяў Беларусі. Плануецца, што хутка будзе створана намінацыйнае дасье для прызнання яго значнасці і на міжнародным узроўні.

### Пакачаемся па расе — каб былі здаровыя ўсе!

А вось у Вяззі, што на Асіповічыне, па ініцыятыве мясцовых аматараў беларускай каранёвай культуры абрад Юр'я быў адноўлены. Тут ужо колькі гадоў існуе народны ансамбль «Вязанка». Пад кіраўніцтвам Мікалая і Ірыны Забаўскіх прадстаўнікі розных прафесій пераймаюць ад старажылаў песні, вучацца мясцовай манеры іх выканання, самі шыюць і вышываюць строі, адпаведныя адметнасцям традыцыйнага адзення рэгіёна. Усе працуюць па ўласнай ахвоце, таму і святы, што ладзіць «Вязанка», атрымліваюцца неймаверна душэўнымі і цёплымі.


Перад абрадам усе спявачкі з Пагоста збіраюцца ў двары дома бабы Каці.

Дарэчы, гэтыя мясціны надзвычайнай прыгажосці звязаныя з лёсам аднаго з пачынальнікаў беларускай літаратуры, паэта і перакладчыка Максіма Багдановіча. Тут ён улетку неяк гасцяваў у цёткі разам з маці Марыяй Мякотай, і мясцовыя кажуць, што менавіта ў Вяззі маленькі Максім пачуў беларускае слова, асабліва ж падабалася яму... лаянка.

Так, Юр'я ў выкананні народнага ансамбля «Вязанка» прайшло ў суправаджэнні капэлы традыцыйных інструментаў — гармоніка, бубна, барабана, цымбалаў і нават... дуды. Дарэчы, гэты інструмент, які іграе ў не зусім звыклым строі, зрабіў для Мікалая Забаўскага вядомы майстар, даследчык дудачнай традыцыі нашай краіны Тодар Кашкурэвіч. Менавіта з вяснянкі, якую іграе дудар, пачынаецца свята ў полі. Удзельнікі абраду заходзяць на поле праз своеасаблівую браму, зробленую з ручніка. Жанчыны і дзяўчаты нясуць хлеб на ручніку, ікону, галінку вярбы. Маюць яны з сабой і велікодныя яйкі — падарункі святому Юр'ю са святочнага стала.

Павітаўшыся з нівай, удзельніцы абраду спяваюць песні, кажуць замовы, акрапляюць жыта, прыносяць дары Юр'ю — акрайчык хлеба, велікодныя яйкі: "Як гэта ячка цэленькае і кругленькае, няхай мая скацінка будзе сытая і поўная».

Вельмі важнае месца падчас абраду адводзіцца просьбам добрага здароўя для скаціны, каб каровы і козы давалі больш малака. Яны гучаць у песнях, рытуальных словах. Напрыклад, у такой замове: «Ідзі, мая кровачка, на Юр'еву пасцель, на Міколаву траву па вялікія ўдоі, па белыя сыры, па жоўтыя маслы. Я з духам, Святая Прачыстая, са сваімі рукамі па сырой траве расу збіраю, табе, мая каровачка, малака прыбаўляю».

**Баба Каця лічыць, што старажытнаму забабону можна верыць: «Старыя людзі не былі дурныя».**

Лічылася, што ў дзень свята Юр'я раса на ніве валодае гаючай сілай. Ёй мылі твар, мазалі вочы — каб мець добры зрок. А падчас абраду яго ўдзельнікі качаліся па полі, каб набрацца сіл ад зямлі і быць здаровымі на працягу ўсяго года. Важна было падчас свята і павесяліцца, патанцаваць, каб скінуць з цела стому пасля зімы. У Вяззі ў гэты час любяць спяваць вось такую песню:

*Карагод вялікі — вуліца малая,*
*Вох-люлі, вох-люлі вуліца малая.*
*Недзе таму карагоду раскалыхацца,*
*Вох-люлі, вох-люлі раскалыхацца.*
*А хто за старымі, а хто за малымі,*
*Вох-люлі, вох-люлі, а хто за малымі...*

**Расказам пра Юр'я праграма «Наперад у мінулае» завяршае шэраг матэрыялаў пра вясновыя абрады беларусаў. Ужо літаральна на наступным тыдні мы зноў выправімся ў дарогу, будзем «вадзіць куста», «праводзіць русалку» — натуральна, рыхтавацца да Купалля.**

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

## Субота, 20 мая

### Беларусь 1

**7.00** Існасць.
**7.25 Меладрама «Выратаваць мужа».*****
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Дача.
**9.50 Меладрама «Юрачка».***
**11.00** 50 рэцэптаў першага.
**12.10** Вялікі сэлфі-тур.
**12.50** Здароўе.
**13.45, 16.20 Меладрама «Цана кахання».*****
**15.15** Краіна.
**18.05, 21.40 Меладрама «Усе скарбы свету».***
**21.00** Панарама.
**1.50** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05 Дэтэктыў «Такая работа».*****
**7.50, 22.25** Тэлебарометр.
**7.55 Фільм для дзяцей «Казка пра таго, хто хадзіў страху вучыцца».***
**9.00 Серыял «Шчаслівыя разам-4».*****
**10.05** Вяселле без баяна.
**10.40** Анімацыйны фільм «Карапузы ў Парыжы».0
**12.10** «Свет навыварат». Трэвел-шоу.
**13.30** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
**14.35** Капейка ў капейку.
**15.10 Камедыя «Дрэнныя хлопцы».*****
**17.15** Рэпарцёр.
**18.00** «Бітва экстрасэнсаў. 15-ы сезон».
**20.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Паўфінал. У перапынку: Спортлато 6 з 49, КЕНО.
**22.30** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці.
**23.40 Баявік «Тры іксы».*****

### Беларусь 3

**7.35** «Сіла веры».
**8.05, 12.00, 20.15** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.20, 12.10, 20.30, 0.00** «Гэты дзень».
**8.25** «Беларуская кухня». Макарона, запечаная з рыжыкамі.
**8.50, 17.55** «Час кіно».
**9.00 «Цацка». Камедыя.***
**10.35** «Я хачу гэта ўбачыць». Вілейка.
**11.05** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.30** «Навукаманія».
**12.15 «Кіндарвілейскі прывід». Камедыя.0**
**13.50** «На любовь своё сердце настроюˈ...» Булат Акуджава». Музычны спектакль.
**15.40** «Камертон». Народны артыст Беларусі Ігар Алоўнікаў.
**16.05** Юбілейны канцэрт ансамбля «Песняры».
**17.15** «Апошні дзень». Валянціна Талкунова.
**18.05 «Без права на правал». Драма.***
**19.20** «Майстры і куміры». Народны артыст СССР Расціслаў Янкоўскі.
**20.40** «Калыханка».
**21.05 «Максім Перапяліца». Камедыя.***
**22.30** Сусветная класіка. Tina Turner: 50 Anniversary Tour — Live in Holland.
**0.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці кінарэжысёра Мікалая Калініна.

### Беларусь 5

**7.55, 20.50** Самба. Чэмпіянат Еўропы. Фіналы.
**9.55** Тэніс. Турнір WTA. Рым. 1/4 фіналу.
**12.00** Веславанне на байдарках і каноэ. Этап Кубка свету. Мантэмор. Фіналы.
**13.00** Тэніс. Турнір WTA. Рым. 1/2 фіналу.
**15.05** Піт-стоп.
**15.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**16.05** Хакей. Чэмпіянат свету. 1/2 фінала. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
**18.25** Час футбола. Спецыяльны выпуск.
**18.50** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. БАТЭ (Барысаў) — «Дынама» (Мінск). (У перапынку — Час футбола.)
**22.40** Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы.
**23.45** Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
**0.15** Формула-Е. Гран-пры Парыжа.

### АНТ

**7.00, 8.05** «Суботняя раніца».
**8.00, 9.00** (з субцітрамі), **16.00, 20.30** Нашы навіны.
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды».0
**9.20** «Здароўе».
**10.30** «Смак».
**11.15** «Ідэальны рамонт».
**12.15** «Разумніцы і разумнікі».
**13.20** «Удача ў дадатак!» з «Еўраопт».
**14.25** «Вакол смеху».
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Тэорыя змовы».
**17.25** «Ералаш».
**17.40** «Хто хоча стаць мільянерам?»
**18.40** «Творчы вечар Канстанціна Меладзэ».
**21.05** «Сёння ўвечары».
**22.35 Трылер «Траса 60».***

### СТБ

**6.20** «Тайны Чапман».
**7.55** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы».
**9.25** «Рамонт па-сумленнаму».
**10.05** «Самая карысная праграма».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35** «Вечнае жыццё: сведчанні несмяротных».
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40** «Адкрытая размова».
**13.55, 1.10 Меладрама «Мой ласкавы і пяшчотны звер».***
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.35 Маст. фільм «Дзяржаўная граніца. Смяротны ўлоў».***
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Засакрэчаныя спісы. Фатальныя лічбы».
**22.00 «Жорсткі бізнес». Серыял.**

### МІР

**5.20 Маст. фільм «Прыгоды Бураціна».**
**7.50** «Саюзнікі».*
**8.20, 4.30** М/ф «Маша і Мядзведзь».0
**9.00** «Вой, мамачкі!»*
**9.30** «Любімыя акцёры». Аляксандр Панкратаў-Чорны.*
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Зроблена ў СССР».*
**10.45 Маст. фільм «Злодзеі ў законе».*****
**13.00 Маст. фільм «Труфальдзіна з Бергама».***
**15.30** «Цяжар абеду».*
**16.15 Серыял «Халасцякі».*****
**23.00 Серыял «Спрут».*****

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху».
**7.40 Серыял «Сямейны дэтэктыў».***
**11.00, 14.00** Весткі.
**11.20** «Жывыя гісторыі».
**12.15** «Пяцёра на аднаго».
**13.05** «Наша справа».
**13.20, 14.15 Маст. фільм «Сур'ёзныя адносіны».***
**17.00** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.55** «Аншлаг і Кампанія».
**22.40 Маст. фільм «Захоўвай цябе, каханне маё».***

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00** «Мы і навука. Навука і мы».*
**6.50, 8.20 Серыял «Рускі дубль».*****
**8.00, 10.00, 16.00** Сёння.
**8.50** «Урачэбныя тайны плюс».
**9.25** «Разумны дом».
**10.25** Галоўная дарога.
**11.10** «Ежа жывая і мёртвая».
**12.10** Кватэрнае пытанне.
**13.20** «Удача ў дадатак!»
**14.20 Маст. фільм «Адваротны адлік».*****
**16.20** «Следства вялі...»
**17.10** «Сакрэт на мільён». Уладзімір Праснякоў.***
**19.00** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**20.00** «Ты супер!»
**22.10** «Ты не паверыш!»
**23.00 Баявік «На аднаго менш».**

### 8 канал

**9.00, 15.55, 18.55, 21.15, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры Дзядулі Марка».
**9.20** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**9.30 Маст. фільм «Сісі — маладая імператрыца».**
**11.15 Камедыя «Прыгоды рабіна Якава».**
**13.00 Камедыя «Самая абаяльная і прывабная».**
**14.20 Глядзім усёй сям'ёй. М/ф «Як прыручыць дракона».**
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30** Рэаліці-шоу «Вяселле па разліку».
**17.00** М/ф.
**17.15, 19.00 Меладрама «Анёл у сэрцы».**
**20.50** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Камедыя «Карнавал».**

### ВТБ

**6.00** Скетч-шоу «6 кадраў».***
**7.00, 2.30** «Ералаш».0
**8.30, 3.00** М/ф «Фіксікі».0
**8.50, 3.20** М/ф «Смяшарыкі».0
**9.10, 3.40** М/ф «Машыны страшылкі».0
**9.30** М/ф «Егіптус».0
**10.00** Серыял «Супер Макс».***
**11.00** Серыял «Апошні з Магікян-5».***
**13.00** «Проста кухня».***
**13.30, 1.30** «Турбамікселр».***
**15.10** Фантастыка «Кідок кобры».*
**17.20** Анімацыйны фільм «Кот Гром і зачараваны дом».0
**19.10** Камедыя «Сэрцаедкі».*
**21.30** «Уральскія пельмені».***
**23.00** Жахі «Плецены чалавек».***
**1.00** «Сэрцы за каханне».***
**4.00** «Лаві момант».***
**5.00** «Дурні і дарогі».***

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** «Свяціцель Мікалай. Каб смутак ператварыўся ў радасць». Дак. фільм.
**10.35** «Без віны вінаватыя». Маст. фільм.
**12.10** Пернікавы домік. «Песня сэсэна».
**12.35** «На гэтым тыдні... 100 гадоў таму. Нефрантавыя нататкі».
**13.05** «Дзікая прырода Славакіі». Дак. фільм.
**13.55** «Міфы Старажытнай Грэцыі». Дак. серыял.
**14.25** «Лэдзі ў цягніку». Маст. фільм.
**16.00** «Больш чым каханне». Ілья і Ірына Рутберг.
**16.40, 2.40** Сусветныя скарбы.
**17.00** Навіны культуры.
**17.30** «Продкі нашых прадкаў». Дак. серыял.
**18.10** «За сталом сямі мораў». Канцэрт Алега Пагудзіна ў Дзяржаўным Крамлёўскім палацы.
**19.30** «Дуэння». Маст. фільм.
**21.00** «Агора». Ток-шоу.
**22.05** «Белая студыя».
**22.45** Кіно на ўсе часы. «Сямейная змова». Маст. фільм.
**0.50** «Ці ёсць будучыня ў палярных мядзведзяў?» Дак. фільм.
**1.40** «Свята». М/ф для дарослых.
**1.55** «Шукальнікі». «Меморыі Гогаля».

### Настальгія

**5.55** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Піянерскія лагеры». 2005 год.***
**6.50** Маст. фільм «Калі верыць Лапатухіну...»***
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час».*
**9.40, 11.00, 15.40, 18.45, 20.00, 23.50, 0.55, 2.40, 3.40, 5.00** Музычная настальгія.*
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».*
**11.55, 18.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1966. 2009 год.***
**12.40** Тэлеспектакль «Бывай, зброя!»***
**16.00** «Колба часу».***
**17.00** «Кінапанарама» з Э. Разанавым: «Майстры савецкага кіно». 1-я частка. 1982 год.*
**19.00** Маст. фільм «Вяселле».***
**20.15** Праграма «Тэма» з У. Лісцьевым: «Дзеці знакамітасцяў». 1992 год.*
**21.00** «Быў час». 2009 год.***
**21.55** Тэлеспектакль «Спяшайцеся рабіць дабро». Маскоўскі тэатр «Сучаснік».***
**0.00** «Яловая субмарына» з Аляксандрам Ліпніцкім. «Гісторыя рускага рока. В. Цой». «Дзеці хвілін». 1-я частка: «У кожнага сваё КІНО». 2008 год.***
**1.30** Маст. фільм «Гонкі па вертыкалі». 3-я серыя.***

### EuroSport 1

**4.00** Футбол. Юнацкі чэмпіянат Еўропы (U-17). Фінал.
**5.30, 13.15, 14.30, 1.00, 2.30** Веласпорт. «Джыра д'Італія».
**7.00, 12.30, 18.30, 21.30, 23.00** Веласпорт. «Тур Каліфорніі».
**7.45, 10.15, 19.00** Футбол. Чэмпіянат свету сярод маладзёжных каманд (U-20).
**10.00** Watts.
**14.15, 18.15** Веласпорт. «Джыра-экстра».
**20.00** Конны спорт. Global Champions Tour.
**23.00** Футбол. Чэмпіянат MLS.
**2.00** Watts.

### Кінакамедыя

**0.40** Меладрама «Каралеўства поўнага месяца».***
**2.20** Камедыя «Марафон для трох грацый».*
**4.00** Камедыя «Калачы».***
**05.30** Камедыя «Няўдачлівыя».***
**7.10** Камедыя «Кахае не кахае».***
**8.45** Камедыя «Прышэлец з космасу».***
**10.30** Камедыя «Дзяўчына з Манака».***
**12.15** Камедыя «Забойныя агеньчык».***
**14.00** Скетчкам «Паміж намі».***
**14.20** Камедыя «Як украсці брыльянт».***
**16.00** Меладрама «Каханне і іншыя акалічнасці».***
**17.50** Камедыя «Фартуна Вегаса».***
**19.30** Камедыя «Месяцовая афёра».****
**21.15** Камедыя «Нашы палюбоўнікі».****
**22.55** Камедыя «Мытня дае дабро».***

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**10.00** «Хронікі маскоўскага побыту».
**10.50, 5.35** «Доказ віны».
**11.25, 2.20** «Забойства на траіх». Серыял.*
**15.10** «Стальны гігант». Анімацыйны фільм.0
**16.35** «Апакаліпсіс».
**17.30** «90-я».
**18.25** «10 самых».
**19.00, 1.30** «Амерыканскі жаніх».
**20.00** «Вясельная сукенка». Меладрама.*
**22.00** «Беласнежка і паляўнічы». Маст. фільм.***
**0.10** «Звышнатуральнае». Серыял.

### ТБ1000

**6.10** Эрын Брокавіч — прыгожая і рашучая.***
**8.50** Іншыя.***
**11.05** Вельмі дрэнная настаўніца.****
**13.10** Незвычайныя прыгоды Адэль.*
**15.25** Найлепшае ўва мне.*
**17.50** Сцежкі.***
**20.10** Дасканалы свет.***
**22.55** Сенсацыя.***
**0.50** Вялікія вочы.***
**2.50** Твары ў натоўпе.***
**4.30** Пасвячоны.*

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Добры хлопчык.*
**8.15** Фарт.*
**10.15** Вайна полаў.***
**12.00** Востраў загінулых караблёў.*
**14.35** Пра любофф.***
**16.40** Крыжаносец.***
**18.40** Эластыка.***
**20.20** Легенда №17.*
**22.55** Мама, не бядуй!****
**0.35** Стрытрэйсеры.***
**2.50** На кручку!***
**4.30** Мальтыйскі крыж.***

### National Geographic

**6.00** Гульні розуму.*
**6.50** Навуковыя недарэчнасці.*
**7.15, 9.50, 12.20** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам.***
**13.15, 15.35, 18.00, 21.00** Пачатак.*
**18.45** Космас: прастора і час.*
**20.10** Геній.***
**21.45** Выратаваць планету.*
**0.15** «Без цэнзуры».***
**1.00, 3.25, 5.10** Вядомы Сусвет.*

### Discovery

**8.00** Праверана на сабе.*
**9.00** Залатая ліхаманка.***
**10.00** Ратавальнікі-цяжкавагавікі.***
**11.00, 23.00** Кола: гульня на выжыванне.***
**12.00** Голыя і напалоханыя.
**13.00, 1.00** Аляска: сям'я з лесу.***
**14.00, 22.00** Хлопцы з Юкана.***
**15.00** Апошнія жыхары Аляскі.***
**16.00** Харлі і браты Дэвідсаны.***
**17.00** Космас навыварат.
**18.00, 7.10** Геній аўтадызайну.*
**19.00, 0.00** Унікальныя тачкі.*
**20.00** Вулічныя гонкі.***
**21.00** Смяротны ўлоў.***
**2.00** Гульня на жыццё.***
**4.40, 6.45** Таргі без тармазоў.*

## Zамор'е

## Грошы з'ем, але не аддам!

**Жыхарка Калумбіі праглынула 90 стадоларавых купюр, каб не дзяліцца імі з былым грамадзянскім мужам, паведаміла пракуратура дэпартамента Сантандэр, перадае РІА Навіны.**



28-гадовая дзяўчына з'ела дзевяць тысяч долараў, нажытых падчас сумеснага жыцця. У выніку ёй спатрэбілася дапамога ўрачоў, якія і дасталі незвычайны «абед». Тым не менш, жанчына панаракала, што ў прыдатным стане засталіся ўсяго 5,7 тысячы, а прыкладна трэць грошай паспела «сапсавацца». У пракуратуры паведамілі, што не маюць да яе прэтэнзій, паколькі грошы былі атрыманы законным шляхам ад продажу шэрагу актываў былой пары.

## Хто пагаліў катоў?

**Уладальнікі свойскіх жывёл у амерыканскім горадзе Шэнандоа-Вэлі, штат Вірджынія, занепакоеныя дзеяннямі зламысніка, які... голіць катоў, паведамляе Associated Press.**



Са снежня невядомы лавіў сем катоў, галіў ім лапы або жывот, пасля чаго адпускаў. Капітан паліцыі Келі Уокер сцвярджае, што ў астатнім жывёлы не пацярпелі, хоць некаторыя з іх пасля вяртання мелі «ўсхваляваны выгляд». Паводле яго слоў, усе гадаванцы, якія сталі ахвярамі зламысніка, былі дагледжанымі і насілі нашыйнікі. Ён растлумачыў, што даведаўся аб праблеме толькі на гэтым тыдні, калі да яго звярнуўся мясцовы жыхар, які хоча расклеіць аб'явы з просьбай паведамляць паліцыі інфармацыю пра шкодніка. Уокер не змог назваць злачынства, у якім можна абвінаваціць чалавека, які пагаліў катоў без дазволу, але заявіў, што ўладальнікі жывёл хацелі б, каб гэта спынілася.

## Паміж двума таўстунамі

**Аўстраліец падаў у суд на American Airlines з-за таго, што яму давялося на працягу 14-гадзіннага рэйса сядзець паміж двума тоўстымі спадарожнікамі. Майкл Энтані Тэйлар патрабуе ад амерыканскай авіякампаніі больш за 100 тысяч долараў кампенсацыі, піша The Daily Telegraph.**



Падчас пералёту з Сіднэя ў Лос-Анджэлес 67-гадовы мужчына быў вымушаны сядзець у нязручным становішчы і, нават, часам стаяць, таму што два яго суседы з абодвух бакоў не змяшчаліся ў крэслах і перашкаджалі Тэйлару. Сцюардэсы адмовіліся перасадзіць вандроўца на іншае месца. У выніку ў Тэйлара абвастрыўся сколіёз, ён атрымаў траўмы спіны і шыі. Юрыст Томас Джэнсан растлумачыў, што, калі мужчына выйграе справу, услед за ім іскам можа рушыць мноства аналагічных зваротаў у суд. Абаронца лічыць, што авіякампаніям могуць прад'явіць прэтэнзіі з нагоды дызайну крэслаў у самалётах і таго, як яны рассаджваюць пасажыраў у салонах.

**Іван КУПАРВАС.** hvir@zviazda.by

# МОЙ КОНІК

**Калі ў Англіі даўно ўжо праводзяцца чэмпіянаты па квідзічы (яздзе на мётлах), то ў Фінляндыі таксама з'явілася сваё захапленне: верхавая язда на цацачных коніках — хобіхорзінг. Дзяўчаты, якія гэтым займаюцца, лічаць яго і хобі, і новым відам спорту і нават праводзяць сапраўдныя спаборніцтвы.**



У яздзе на цацачных коніках нічога новага няма. Да пэўнага часу гэтым тэрмінам карысталіся даследчыкі фальклору, каб апісаць касцюміраваных персанажаў — удзельнікаў народных свят. У Фінляндыі ўжо больш за 10 тысяч аматараў гэтага хобі, у асноўным дзяўчаты-падлеткі, але некаторыя хлопцы таксама прымаюць удзел у гэтых імправізаваных скоках. Большасць дзяўчат, якія катаюцца на цацачных коніках, вельмі любяць коней сапраўдных. Але займацца конным спортам у Фінляндыі вельмі дорага, таму для многіх з іх уяўная верхавая язда — выдатны кампраміс. «Наезніцы» часта ствараюць сваіх коней самі. 18-гадовая Тая Туркі, якая трэніруе іншых энтузіястаў, кажа: «Для людзей вельмі дзіўна ўбачыць гэта, асабліва першы раз, таму што яны думаюць, што мы лічым коніка жывым, але на самай справе гэта не так».



Па хобіхорзінгу праводзяцца самыя сапраўдныя спаборніцтвы, якія прыраўноўваюцца да спартыўных спаборніцтваў. І там усё сапраўды па-дарослому: на турнірах ацэньваюць выездку і скачкі — дзяўчаткі стараюцца паўтарыць элегантныя рухі сапраўднай язды, пераскокваюць праз перашкоды. Дарэчы, нядаўна ў красавіку ў фінскім горадзе Вантаа прайшоў фестываль гэтых катанняў, які аб'яднаў каля 200 спартсменаў і некалькі тысяч гледачоў. На спаборніцтвах журы звяртаюць увагу не толькі на спартыўны складальнік, але і на знешні выгляд коніка: акуратнае аздабленне і ўпрыгажэнні. Адна з удзельніц модных спаборніцтваў 20-гадовая Аліса Аарніямякі да таго, як пачаць катацца на коніку на палцы, 10 гадоў займалася сапраўднай верхавой яздой. Паводле яе слоў, хобіхорзінг — вельмі нават дэмакратычная забаўка і цалкам прыдатная альтэрнатыва жывому коніку.



У многіх скачкі дзяўчат праз перашкоды на цацачных коніках наогул выклікаюць смех, а то і нянавісць. У інтэрнэце досыць з'едлівых каментарыяў з нагоды хобіхорзінга. Часам даходзіць да таго, што дзяўчаткі вымушаны хаваць, што займаюцца яздой на цацачных коніках. Але шмат хто з іх гатовы адстойваць сваё права на гэта незвычайнае захапленне. Ну і права называць гэты занятак спортам, вядома.

## Нядзеля, 21 мая

### Беларусь 1

**6.50, 16.45 Меладрама «Выратаваць мужа».***
8.30 Народная раніца.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
**9.45 Меладрама «Юрачка».***
11.00 «50 рэцэптаў першага».
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 Каробка перадач.
**13.10, 0.10 Меладрама «Красуня».***
15.15 Твой горад.
15.30 Вакол планеты.
16.15 Кулінарная дыпламатыя.
20.05 Навіны надвор'я.
20.30 Галоўны эфір.
21.40 Хакей. Чэмпіянат свету. Фінал.
22.00 Спортлата 5 з 39, КЕНО.
22.40 «Вялікая ілюзія на Кіпры».

### Беларусь 2

**7.05 Дэтэктыў «Такая работа».***
7.50, 23.15 «Анлайн». Скетчкам.
8.20, 18.10, 22.35 Тэлебарометр.
8.25 «Свет навыварат». Трэвел-шоу.
9.45 «Калі мы дома». Скетчкам.***
**10.55 Камедыя «Дрэнныя хлопцы».***
**13.00 Маст. фільм «Сацыяльная сетка».***
15.05 «Каханне анлайн». Рэаліці-шоу.
16.10 «Універ-шэф».
16.45 Два рублі.
17.05 «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу.
18.40 Міжнародная ліга КВЗ. 1/8 фіналу.
**20.25, 22.05 Баявік «Тры іксы».***

### Беларусь 3

7.35 «Музеі Беларусі». Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы і яго філіял «Вязынка».
8.05, 11.20, 20.15 «Калейдаскоп». Навіны культуры.
8.20, 11.35, 20.30, 23.40 «Гэты дзень».
8.25 «Беларуская кухня». Рулька ў піве.
**8.50 «Кіндарвілейскі прывід». Камедыя.0**
10.25 М/ф.0
11.40 «Наперад у мінулае».
12.05 «Нацыянальны хіт-парад».
13.00, 21.05 «Час кіно».
**13.10 «Без права на правал». Драма.***
14.25 У. Шэкспір. «Макбет». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага.
**16.35 «Максім Перапяліца». Камедыя.***
18.05 Юбілейны вечар народнага артыста Беларусі Сяргея Картэса.
19.35 «Апошні дзень». Валянціна Талкунова.
20.40 «Калыханка».
**21.10 «Цацка». Камедыя.***
22.45 «Гітара па крузе».

### Беларусь 5

8.00 Тэніс. Турнір WTA. Рым. 1/2 фіналу.
10.00 Хакей. Чэмпіянат свету. 1/2 фіналу.
12.00, 16.35 Хакей. Чэмпіянат свету. Агляд гульнявога дня.
12.30 Веславанне на байдарках і каноэ. Этап Кубка свету. Мантэмор. Фіналы.
14.25 Мастацкая гімнастыка. Чэмпіянат Еўропы.
16.05 Фактар сілы.
17.05 Хакей. Чэмпіянат свету. Матч за 3-е месца. (У перапынках — Спорт-цэнтр.)
19.20 Тэніс. Турнір WTA. Рым. Фінал.
20.55 Баскетбол. Еўраліга. Фінал 4-х. Фінал. (У перапынку — Спорт-цэнтр.)
23.00 Самба. Чэмпіянат Еўропы. Фіналы.

### АНТ

7.00, 8.05 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00 (з субцітрамі), 16.00 (з субцітрамі) Нашы навіны.
9.05 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІН-код».
9.40 «Бесталковыя нататкі».
10.00 «Пакуль усе дома».
10.55 «Фазэнда».
11.30 «Краіна саветаў. Забытыя правадыры».
**13.30 Дэтэктыў «Тайна «Чорных драздоў».**
15.25 «Подых планеты».
16.15 Навіны спорту (з субцітрамі).
16.20 «Шансон года». Частка 2-я.
18.25 «Найлепш за ўсіх!»
20.00 Контуры.
21.05 «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Вышэйшая ліга.
**23.15 Камедыя «Шукайце жанчыну».**

### СТБ

**6.40 Маст. фільм «Дзяржаўная граніца. Смяротны ўлоў».***
8.30 «Скардзіцца дазваляецца».
8.50, 16.50 «Аўтапанарама».
9.20, 11.40, 15.15, 20.25, 23.45 «Тайны Чапман». Спецпраект.
11.00 «Вялікае снеданне».
13.30, 16.30 «24 гадзіны».
**13.40, 1.25 Камедыя «Будзьце маім мужам».***
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
17.20 «Ваенная тайна».
19.30 «Тыдзень».
**22.10 Маст. фільм «Без пачуццяў».***

### МІР

6.00 «Мільён пытанняў пра прыроду».
6.10 «Такія дзіўныя».***
6.40, 7.25, 9.20 М/ф «Маша і Мядзведзь».0
6.55 «Нітка да ніткі».*
7.50 «Культ/Турызм».***
8.20 «Беларусь сёння».*
8.50 «Яшчэ танней».*
9.30 «Любімыя акцёры 2.0».*
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
**10.15 Серыял «Загадка для Веры».***
**14.00 Маст. фільм «Міміно».***



**16.15, 22.00 Серыял «Востраў непатрэбных людзей».***
21.00 «Разам».
**0.25 Серыял «Халасцякі».***

### РТР—Беларусь

7.00 «Пакой смеху».
**7.35 Маст. фільм «Захоўвай цябе каханне маё».***
11.00, 14.00 Весткі.
11.20 «Сам сабе рэжысёр».
12.15 «Смехапанарама Яўгена Петрасяна».
12.50 «Ранішняя пошта».
**13.30 «Ха». Маленькія камедыі.**
14.15 «Смяяцца дазваляецца».
15.30 «Вялікая ўдача».
**16.20 Маст. фільм «Школьны вальс».0**
**18.10, 22.30 Маст. фільм «Спальваючы масты».***
20.00 Весткі тыдня.
21.30 Ток-шоу «Што адбываецца».
0.00 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТВ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00 «Аднойчы...»***
**6.35, 8.20 Серыял «Рускі дубль».***
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.40 «Вуснамі дзіцяці».
9.25 Ядзім дома.
10.20 «Першая перадача».
11.00 «Цуд тэхнікі».
12.00 «Дачны адказ».
13.10 «НашСпажыўНагляд».
**14.15 Маст. фільм «Адваротны адлік».***
16.20 «Следства вялі...»
18.05 «Новыя рускія сенсацыі».
19.00 «Вынікі тыдня».
**20.10 Дэтэктыў «Бірук».***
23.20 «Зоркі сышліся».***

### 8 канал

9.00, 15.50, 19.05, 21.00, 23.55 «Надвор'е».
9.05 «Сябры Дзядулі Марка».
9.45 «Адшукваецца адпачынак».
10.15 «Мой любімы гадаванец».
**10.45 Серыял «Камісар Рэкс».**
**12.20 Меладрама «Музыка сэрца».**
**14.25 Меладрама «Заказ».**
**15.55 Глядзім усёй сям'ёй. Маст. фільм «Белы палон».**
**18.10 Серыял «Пуаро Агаты Крысці».**
**19.00 Трылер «Дар».**
20.50 «Вечарніца».
**21.05 Трылер «Павуцінне хлусні».**
23.15 Дак. фільм «Дыялог з усім светам».

### ВТБ

6.00 Скетч-шоу «6 кадраў».***
7.00, 2.30 «Ералаш».0
8.30, 3.00 М/ф «Фіксікі».0
8.50, 3.20 М/ф «Смяшарыкі».0
9.10, 3.40 М/ф «Машыны страшылкі».0
9.30 М/ф «Егіптус».0
10.00 Серыял «Супер Макс».***
11.00, 1.40 «Турбаміксер».***
12.00 «Паспець за 24 гадзіны».***
13.10 Серыял «Апошні з Магікян-5».*
15.10 Фантастыка «Кідок кобры-2».*
17.20 Анімацыйны фільм «Рогі і капыты».0
19.10 «Уральскія пельмені».***
20.50 Драма «Злаві мяне, калі зможаш».*
23.30 Серыял «Галыгін.ru».***
0.00 Еўрапейскі покерны турнір.****
0.50 «Кіно ў дэталях».***
4.00 «Лаві момант».***
5.00 «Дурні і дарогі».***

### Культура

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт».
10.35 «Дуэння». Маст. фільм.
12.05 «Расія, любоў мая!» «Адыгі з Сочы».
12.35 Геніі і ліхадзеі. Міхаіл Сомаў.
13.05 «Ці ёсць будучыня ў палярных мядзведзяў?» Дак. фільм.
13.55 «Міфы Старажытнай Грэцыі». Дак. серыял.
14.25 «Не страляйце ў аператара!»
15.05 «Што рабіць?»
15.50 Вольга Перацяцька, Ганна Нятрэбка, Ільдар Абдразакаў, Юсіф Эйвазаў, Васіль Ладзюк у гала-канцэрце на Палацавай плошчы Санкт-Пецярбурга.
17.40, 1.55 «Шукальнікі». «Код «Чорнага кабінета».
18.25 «Бібліятэка прыгод».
18.40 «Прыгоды Квенціна Дорварда, стралка каралеўскай гвардыі». Маст. фільм.
20.15 80 гадоў з дня нараджэння Сафіко Чыаурэлі. «Больш чым каханне».
20.55 «Некалькі інтэрв'ю па асабістых пытаннях». Маст. фільм.
22.25 «Блізкае акружэнне Сяргея Салаўёва».
23.50 «Без віны вінаватыя». Маст. фільм.
1.25 «Шут Балакіраў». «Зніклы аркестр». М/ф для дарослых.
2.40 Сусветныя скарбы.

### Настальгія

5.55, 12.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1966. 2009 год.***
6.40 Тэлеспектакль «Бывай, зброя!»***
9.00, 3.00 «Мінулы час».*
9.40, 12.50, 14.00, 17.50, 23.35, 3.40, 5.00 Музычная настальгія.*
10.00 «Колба часу».***
11.00 «Кінапанарама» з Э. Разанавым: «Майстры савецкага кіно». 1-я частка. 1982 год.*
13.00 Маст. фільм «Вяселле».***
14.15 Праграма «Тэма» з У. Лісцьевым: «Дзеці знакамітасцяў». 1992 год.*
15.00 «Быў час». 2009 год.***
15.55 Тэлеспектакль «Спяшайцеся рабіць дабро». Маскоўскі тэатр «Сучаснік».***
18.00 Маст. фільм «Звычайная гісторыя».***
20.20 «Вячэрнія мелодыі». 1984 год.*
21.05 Фільм-спектакль «Маленькія камедыі вялікага дома». Спектакль Маскоўскага тэатра сатыры.***
23.55 «Быў час» з Аляксандрам Палітковскім: «Піянерскія лагеры». 2005 год.***
0.50 Маст. фільм «Калі верыць Лапатухіну...»***
4.00 «Народжаны ў СССР».*

### EuroSport 1

4.00, 6.00, 10.00, 12.00, 14.15, 0.00, 2.30 Веласпорт. «Джыра д'Італія».
7.00, 11.00, 18.30 Веласпорт. «Тур Каліфорніі».
7.45, 20.00, 1.00 Футбол. Чэмпіянат свету сярод маладзёжных каманд (U-20).
14.00, 18.15 Веласпорт. «Джыра-экстра».
21.30 Футбол. Чэмпіянат MLS.
23.30 Футбол. «ФІФА».

### Кінакамедыя

0.50 Прыгоды «Вакол свету за 80 дзён».*
3.00 Камедыя «Марафон для трох грацый».*
05.00 Меладрама «Марафон».***
6.55 Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».***
8.55 Камедыя «Давай, да пабачэння!»***
10.35 Камедыя «Скандынаўскі фарсаж».***
12.15 Камедыя «Скандынаўскі фарсаж. Гонкі на лёдзе».***
14.00 «Камедыянты (Шоу)».***
14.30 Камедыя «Шчаслівае сямейства».***
16.00 Камедыя «Манія велічы».***
17.55 Камедыя «З шчаслівым парасяці».****
19.45 Камедыя «Казанова».***
23.00 Меладрама «Мілая Фрэнсіс».***

### ТБ3

6.00 М/ф.
10.10 «Паненка і кулінар».
10.45, 1.40 «Цікаўная Варвара». Серыял.
14.30 «Жонка. Гісторыя кахання».
15.55 «Рэвізора».
19.00 «Амерыканскі жаніх».
20.00 «Без падману».
20.50 «Кожную нядзелю». Драма.***
23.45 «Асцярожна, махляры!»
0.15 «Звышнатуральнае». Серыял.
5.10 «Вялікія пачуцці».

### ТБ1000

6.10, 17.45 Гонар і прадузятасць.*
8.40 Вялікія вочы.***
10.50 Дасканалы свет.***
13.40 Пасвячоны.*
15.40 Твары ў натоўпе.***
20.10 Паляўнічыя на тролляў.***
22.15 Версія.***
0.40 Інтэрв'ю з вампірам.***
3.05 Джэры Магуаер.***
5.25 Гадзіла.*

### ТБ1000 Рускае кіно

6.20 Легенда №17.*
8.50 Мама, не бядуй!****
10.30 Стрытрэйсеры.***
12.40 Замры-памры-ўваскрэсні!***
14.45 Эластыка.***
16.30 Мальтыйскі крыж.***
18.30 На кручку!***
20.20 Атамны Іван.
22.40 Мама, не бядуй!-2.***
0.40 Ведзьма.***
2.30 КосцяНіка. Час лета.*
4.40 Увесь гэты джэм.***

### National Geographic

6.00 Гульні розуму.*
6.50 Навуковыя недарэчнасці.*
7.15, 9.40, 11.10 Навука будучыні.*
11.55 Пачатак.*
12.40, 15.05, 18.00, 21.00, 1.00 Геній.***
13.35 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.*
18.50 Тайныя гісторыі.*
19.15, 3.30, 5.10 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.***
21.50, 1.50 Апошнія тайны Трэцяга рэйха.***
23.20 «Без цэнзуры».****
0.15 Даследчык.****

### Discovery

8.00 Смяротны ўлоў.***
11.00, 20.00, 4.40, 7.10 Загадкі планеты Зямля.***
12.00, 21.00 Праверана на сабе.*
13.00, 22.00 Амерыканскія вынаходкі.*
14.00 Зорнае выжыванне.***
15.00 Смяротны ўлоў.***
16.00, 23.00 Залаты шлях.***
17.00, 1.00 Легенда пра золата кракадзілаў.***
18.00 Залатая ліхаманка.***
19.00 Траса Калыма: дабраца наперакор.*
0.00 Геній аўтадызайну.*
2.00, 4.15 Прапажы на продаж.*

*У праграме магчымы змяненні.*
*Перадрукоўка праграмы забаронена.*

АБО ВЯСЁЛЫЯ І ПРАЎДЗІВЫЯ ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

# АЛЁ, НАРОД НА ПРОВАДЗЕ!

## «ПАДАРУНАК» ДЛЯ ЗАЙЦА

Для пачатку анекдот. У аўтобус заходзіць кантралёр, а яму, можна сказаць, пад ногі — адзін з пасажыраў:

— Дайце выйсці! — крычыць.

— Спачатку — білет, — не прапускае яго кантралёр.

— Мне часу няма! Пусціце, а то...

— А то што?

— А то будзе як учора.

Насцярожыўся кантралёр, бо перад ім — чалавек як чалавек: з густам апрануты, інтэлігентны... «Не, — думае, — не падобны гэты пасажыр на «зайца». Хутчэй — на нейкага начальніка...» Узяў, карацей, ды выпусціў яго. Адзінае — спытаў услед:

— Дык а што ж учора было?

— Учора? Штрафу ўляпілі! — выпаліў «заяц» і зайшоўся ад рогату.

Адзін мой шапачны знаёмец — быў час — таксама за праезд не плаціў. Праўда, тактыку выбраў іншую — выпадкова. Зайшоў аднойчы ў аўтобус, працягнуў сто рублёў (драбнейшых грошай проста не меў), а кандуктар іх не бярэ, кажа, дзе я вам рэшты вазьму?.. «Гэта добра», — падумаў пасажыр і з таго самага дня ўзяў за правіла — час ад часу ездзіць у аўтобусе з «дзяжурнай» сторублёўкай. Прычым — смела, з «чыстым» сумленнем, бо ніхто ж не аштрафуе, не папракне...

Колькі так доўжылася, сказаць не магу, але ж у адзін нядобры для «зайца» дзень (а на працу, на завод, ён заўсёды ездзіў у адзін і той жа час і на адным і тым жа аўтобусе) кандуктар... узяла ў «зайца» сторублёўку, смела адарвала... 25 талонаў (сказала, што ён без аплаты на цэлы рубель наездзіў) і пальцам паказала на торбачку, што стаяла на першым сядзенні:

— Там ваша рэшта: 99 рублёў. Можаце пералічыць.

Пасажыр зазірнуў унутр і аж збялеў: у торбачцы былі адны медзякі — па адной, дзве, тры і пяць капеек! «Вось гэта «падарунак!» — падумаў ён.

— Што, чужая яечня не вечна? — засмяяліся пасажыры. — Трапіў жучка ў панскую ручку?

«Зайцу» адказаць не было чым, а таму, схапіўшы грошы, ён выскачыў з аўтобуса. І пасля гэтага без білета, казалі, больш ніколі не ездзіў.

**Уладзімір Пернікаў,**

*г. Гомель*

## «СТАЯЛА І БУДЗЕ СТАЯЦЬ!»

...У тую вясну з надыходам цяпла мужчыны-вяскоўцы павыходзілі на вуліцу — сталі папраўляць платы, прыбірацца на падворках, жанчыны — калупацца ў кветніках. Гледзячы на гэта, Андрэй таксама вырашыў заняцца справай: да пасяўной, пакуль ёсць час, падладзіць комін — пачысціць, пабяліць... Для гэтага адну драбіну ён прыставіў да даху, другую — паклаў паверх шыферу і зачапіў за вільчык. Потым да вяроўкі прывязаў двухкілаграмовую гіру, квач і палез на дах.

Трэба заўважыць, што з прыходам прыроднага газу печаў у вёсцы амаль не засталося — паразбіралі многія. Алеся, Андрэева жонка, таксама хацела: і ўгаворвала, і прасіла, — муж нічога «не чуў», бо вельмі ж любіў паляжаць там увечары (альбо і днём...) — пагрэць свае косці.

Комін вось толькі не чысціў — гады са тры. А тут нарэшце дабраўся, апусціў у дымаход гіру і...

Лесвіца, што ляжала на шыферы, паздрадніцку варухнулася (Андрэй ледзь паспеў аберуч ухапіцца за комін) і пры гэтым зачапіла драбіну, прыстаўленую да даху. У выніку абедзве яны грымнулі вобзем.

— Во ліха! — падумаў гаспадар і не на жарт спужаўся, бо зверху добра бачыў, што крычы не крычы, а ніхто не дапаможа, бо вакол — ні душы. Ды і ў вёсцы адны пенсіянеры...

Жонка ж яго ў гэты час нічога не чула не бачыла: яна, падаіўшы карову, парадкавала малако ды завіхалася ля пліты: гатавала мужу снеданне. Як раптам голас... Як быццам Андрэеў? Як быццам кліча яе?

Падышла да акна, зірнула на вуліцу, — нідзе і нікога. «Можа здалося?» — падумала і зноў вярнулася да пліты, да бліноў. Але не паспела перавярнуць чарговы, як той жа голас данёсся зноў — аднекуль з печы:

— Алеся, ты аглухла ці што? Выйдзі на двор! — патрабаваў муж.

Кабета падышла, глянула ў дымаход, гукнула:

— А ты чаго там сядзіш ды крычыш на ўсю вуліцу?

— Выходзь, кажу табе! — настойваў Андрэй.

— Зараз, — сказала ў комін, як у мабільнік.

— Падай мне абору, — камандаваў муж.

— А як? — нічога не разумеючы, пыталася жонка і ўжо «зацягвала» сваю любімую песню: маўляў, я ж казала, выкінем печ... Дык жа не, — яна яму трэба, ён спіну грэе! Вось зараз і сядзі сабе, іншае месца грэй. Можа, паразумнееш!

— Стаў драбіну, — не зважаючы на лямант, камандаваў Андрэй, — з вяроўкаю лезь наверх. Кінеш мне адзін канец.

— А печ выкінеш? — ставіла ўмову жонка, — тады зраблю, як ты кажаш.

На той момант іншага выйсця не было: гаспадар паабяцаў.

Алеся бедная, нацярпеўшыся страху, узлезла па драбіне наверх, з пятай ці шостай спробы такі дакінула мужу вяроўку. Той прывязаў яе да коміна, дабраўся да драбіны, злез на зямлю. А ўжо там — поп сваё, а чорт сваё — узяўся ладзіць новае прыстасаванне, каб пачаць усё спачатку — каб падладзіць комін, бо выкідваць печ ён, вядома ж, не збіраўся.

**Мікалай Багданаў,**

*в. Новы Пагост, Мёрскі раён.*

## ШТО МОЖА СЛОН?

Некалі даўным-даўно мае бацькі (светлай памяці!) бралі на пастой кватарантаў, найчасцей — настаўнікаў. Асобныя з іх дагэтуль у памяці.

Галіна Адольфаўна, напрыклад, была вельмі строгай і патрабавальнай. «Каб дзіця ў сваё шэсць гадоў ды не ўмела пісаць?!» — абурылася неяк яна і сама ж узялася за справу.

Для пачатку, разгарнуўшы новы сшытак у клетачку, настаўніца вывела некалькі палачак ды кручочкаў і папрасіла, каб тое ж зрабіла я. Не скажу, што дужа хацелася, але я старалася — нават вельмі. Думала Галіна Адольфаўна мяне пахваліць... Не: паставіла слабую «троечку» і тым самым аж да школы адбіла ў мяне ўсякую ахвоту да пісьма.

З чытаннем, дзякаваць богу, усё атрымалася інакш. Тут ужо ў настаўніцы хапіла такту: яна і накіроўвала мяне, і развівала... У выніку яшчэ ў малодшых класах я ведала тое, што праходзілі ў старэйшых.

І, дарэчы, акурат тады ж засвоіла досыць мудронае слова «гіпербала». Яго наша Галіна Адольфаўна са школы прынесла.

...Значыць, неяк да яе на ўрок прыродазнаўства завітаў правяральшчык — загадчык райана, уласнай персонай.

Настаўніца адчувала сваю адказнасць і, вядома ж, вельмі старалася падаваць новы матэрыял, правярась у вучняў дамашняе заданне.

Адзін з іх, Віця, смела ішоў да дошкі, досыць упэўнена расказваў пра трапічных жывёл. І Галіна Адольфаўна ўжо збіралася паставіць яму добрую адзнаку, як раптам з апошняй парты на ўвесь клас загучала:

— А скажы ты нам, Віця, — прасіў правяральшчык, — ці можа слон за адзін «прысест» з'есці стог сена?

Хлопчык разгублена паглядзеў на Галіну Адольфаўну (што казаць?). Тая ж прыняла пытанне за жарт і хацела падхапіць яго:

— Стог, — сказала, — гэта, вядома ж, гіпербала...

Ды правяраючы, як выглядае, жартаваць не збіраўся, ён, падняўшы ўгору ўказальны палец, павучальна вымавіў:

— Стог сена гіпербала, можа, і з'есць, а вось слон — не, не зможа...

Сяк-так закончыўшы ўрок і выслухаўшы заўвагі правяральшчыка (ну як жа без іх?), Галіна Адольфаўна зайшлася ад рогату. І ў калег потым толькі і гуткі было, што пра «гіпербалу, якая харчуецца сенам».

...Потым я ўжо сама працавала настаўніцай і, хоць няшмат, але ж кантактавала з загадчыкамі райана. Амаль усе яны былі інтэлігентнымі, адукаванымі людзьмі. Але ж «гіпербала» ўспаміналася таксама! Прычым не раз...

**Лілія Васілеўская,**

*в. Трабы, Іўеўскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

*dounar@zviazda.by*




**У вёску Баянічы, што ў Любанскім раёне, цяпер можна дабрацца без праблем. Але так было не заўсёды. Яшчэ ў 50—60-я гады мінулага стагоддзя населены пункт атачала дрыгва. І жылі тутэйшыя, як тыя людзі на балоце. У суседнія вёскі маглі трапіць толькі позняй восенню або зімой, калі мароз добра скуе зямлю.**

■ Народны гумар

# СЯСТРА ГАБРАВА І АЎЦЮКОЎ

## Як «штукуюць» баянкі

Ганна Перагуд трапіла ў Баянічы па размеркаванні пасля заканчэння культасветвучылішча. Калі ў адведкі да дачкі прыехаў бацька, то быў шакаваны, што па вясковай вуліцы ні прайсці ні праехаць — суцэльная гразь ды лужыны. Хацеў забраць дзяўчыну дамоў, у цывілізацыю, але тая не пагадзілася. І зрэшты не шкадуе. Надта ж самабытныя, каларытныя людзі тут жывуць. І называюць сябе баянкамі. Любяць «паштукаваць» (пажартаваць), як над іншымі, так і над сабой.

— Калі вучылася завочна ў Мінску, выкладчык спытаў у мяне падчас экзамену: «Вы з тых Баянічаў, дзе вала на дуб цягнулі?» — успамінае Ганна Мікалаеўна. — А я ж маладая была, сарамлівая, замуцілася. Але ўзяла сябе ў рукі ды і спытала: «Адкуль вы пра гэта ведаеце?» Той усміхаецца ў адказ: «Мы тут, у Мінску, наслухаліся пра вашых «штукі».

— А ці праўда, што тую няшчасную жывёліну на дуб цягнулі? — пацікавілася я.

— Трэба было аднаму баяніцкаму дзядзьку ярмо для вала зрабіць, — тлумачыць мая суразмоўніца. — Вось і нагледзеў ён на дубе дыхтоўную кульбяку. Паклікаў на дапамогу вяскоўцаў, і яны пацягнулі вала на дрэва — прымяраць яе. «Ці падыходзіць?» — пытаюцца ў яго знізу. «Падыходзіць, і вол задаволены!» — адказвае той.

У свой час Ганна Мікалаеўна запісала ад старажылаў байкі, легенды ды «штукі». Неяк у вёсцы закончылася соль. І баянкі вырашылі яе на градах пасеяць. Чакаюць, чакаюць, а соль так і не ўзыходзіць. Яны і падумалі, што соль — замежная расліна, якая дасць ураджай праз некалькі гадоў.

Было тое ці не, цяпер ужо дакладна ніхто не памятае, але гэтыя «штукі» перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Баянкі і сёння з сябе «штукуюць»: пасеялі калісьці соль у Баянічах, а яна ўзышла пад Салігорскам (Любанскі раён мяжуе з Салігорскім). Любы факт, падзею тут могуць падаць так, што адразу і не зразумееш, праўда гэта ці выдумка. Накшталт: «Мы сеем бульбу ночу, каб каларадскі жук не бачыў».

Адкуль пайшлі гэтыя жарты-гісторыі, цяжка сказаць. Магчыма, людзі, якія амаль цэлы год былі адрэзаны ад бойкіх дарог, цывілізацыі, жылі замкнёнай суполкай, шмат і цяжка працавалі, такім чынам разнастаілі сваё існаванне, весялілі сябе.

Жыў калісьці ў Баянічах дзед Давыдоўскі, які мог бясконца расказваць розныя гісторыі. У яго хаце было надта цёмна. Папрасіў ён суседзяў, каб вокны зрабілі большымі. Дык майстры так выразалі праёмы, што ўсю сцяну агалілі. А яшчэ стары баяў пра тое, як самагонку гнаў. Працэс, так бы мовіць, быў у самым разгары, а тут раптам нешта як загрукае! Госці падумалі, што міліцыя нечакана з'явілася, усхапіліся з месца... Ды гаспадар супакоіў іх: «Не бойцеся, гэта брага грукае».

А вось яшчэ прыдумка. Паленаваліся баянкі рыбу лавіць і вырашылі зварыць юшку проста ў возеры. Распалілі з усіх бакоў вогнішчы і сталі чакаць, пакуль вада закіпіць...

А як вам такое? Сабраліся браты параіцца, як зрабіць, каб у хаце было святлей. «Браточкі, дык давайце ўсе разам, талакой, у мяшках святло наносім!» — прапанаваў старэйшы. Так і насілі да самага вечара...

Падчас калектывізацыі ў вёску прыслалі першы трактар. Пачуўшы гул, самыя спрытныя баянкі залезлі на гумно і ўбачылі, што па дарозе рухаецца «чорт». Пахапалі яны вілы, сякеры і рушылі насустрач нячысціку лупатаму. Хацелі выкалаць яму вочы, каб не бачыў, куды рухацца. Старшыню калгаса баянкі таксама выбіралі арыгінальна: ішлі па сяле і каціслі гарбуз. У які двор закоціцца, гаспадар яго і будзе кіраўніком.

Смешныя гісторыі ў Баянічах не пераводзяцца.

— Маці майго кума, прынамсі, баяла: «Прывезла адна жанчына зерне ў млын малоць, ды прывязала сваёго каня да трактара, які стаяў побач. Пакуль займалася справай, ён і паехаў. Выскачыла кабета следам на вуліцу ды толькі рукамі развяла... Навошта, кажа, каня гнала, магла б муку дадому і на трактары адвезці, — расказаў супрацоўнік Любанскага раённага цэнтра культуры Сяргей Выскварка.

**Падчас калектывізацыі ў вёску прыслалі першы трактар. Пачуўшы гул, самыя спрытныя баянкі залезлі на гумно і ўбачылі, што па дарозе рухаецца «чорт». Пахапалі яны вілы, сякеры і рушылі насустрач нячысціку лупатаму. Хацелі выкалаць яму вочы, каб не бачыў, куды рухацца.**

Шмат «штук» мне ў свой час расказала адна са старэйшых жыхарак Баянічаў Кацярына Беразоўская. «Загадаў аднойчы калгасны брыгадзір баяніцкаму чалавеку адвезці кінамеханіка ў суседнюю вёску. Едучь яны па дарозе, а той усё просіць: пакажы той дуб, на які вала цягнулі. «Пачакай крыху», — кажа дзядзька. Прывозіць ён хлопца пад самы тоўсты дуб ды зганяе з воза. Пакуль той пешшу з апаратурай на плячах дабіраўся да месца, мужчына вярнуўся назад. Брыгадзір і цікавіцца: «Ці адвёз кінамеханіка куды трэба?» — «Так, адвёз. Цяпер ён таму валу, якога на дуб цягнулі, кіно паказвае»...

На жаль, Кацярына Аўдзееўна пайшла з жыцця. Да свайго пахавання жанчына падрыхтавалася загадзя. Зрабіла сабе помнік з выбітай на ім датай нараджэння, які захоўвала ў сенцах пад зрэбнай дзяружкай.

З гэтай нагоды Сяргей Выскварка расказаў цікавы выпадак. Да яго знаёмага прыехалі госці з Германіі, папрасілі паказаць ім мясцовую «экзотыку». Гасцей прывезлі ў Баянічы, дзе побач з сучаснымі дыхтоўнымі дамамі захаваліся маленькія хацінкі, якія амаль што ўраслі ў зямлю, ды калодзежы з «жураўамі». Пабывалі госці і ў Кацярыны Аўдзееўны. Яны доўга не маглі зразумець, навошта жывому чалавеку помнік. «Каб дзецям і ўнукам было менш турбот», — растлумачыла бабуля. Наступны раз, калі той хлопец наведаўся да нямецкіх знаёмых, яны паказалі яму помнік, які заказалі для сябе, — ацанілі практычнасць беларускай жанчыны.

Баянічы, можна сказаць, сталіца гумару Мінскай вобласці. Ужо не першы год тут ладзіцца раённы фэст «У Баянічы — на гулянічы», які збірае не толькі жыхароў Любаншчыны і цэнтральнага рэгіёна, але і шматлікіх гасцей з усёй краіны. У дасціпнасці, «штукарстве» баянкі не саступаюць ні балгарскаму Габраву, ні калінкавіцкім Аўцюкам.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

*lazovskaya@zviazda.by*

УНН 400078331

**23 мая 2017 года в 11.00**
**состоится внеочередное общее собрание**
**открытого акционерного общества**
**«ЭЛЕГАНТ»**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**
1. О согласовании сделок унитарного предприятия «Элегантный дом».

Место нахождения ОАО «Элегант»: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.
Место проведения собрания: г. Гомель, ул. Интернациональная, 13-1.
Время регистрации участников собрания в день проведения собрания с 10.30 до 11.00 по предъявлении документа, удостоверяющего личность (для представителя акционера – доверенность).
Список акционеров для участия в собрании будет составлен на основании реестра акционеров по состоянию на 17 мая 2017 г.
Акционеры могут ознакомиться с материалами по вопросам повестки дня собрания в рабочие дни с 11.00 до 13.00, начиная с 17 мая 2017 г., по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

**Вниманию предприятий, организаций и индивидуальных предпринимателей!**

Фондом «Гроднооблимущество» проводится аукцион с установлением начальной цены продажи, равной одной базовой величине, определенной законодательством по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района:
- Комплекс зданий и сооружений производственной базы по улице Южная, 37, 37А, 37Б в городе Волковыске;
- Комплекс зданий, сооружений цеха по производству красного кирпича. Имущество расположено по адресу: г. Волковыск, ул. Осипенко, 21, 21/1—21/3, 21/8, 21/11—21/14.

**Аукцион состоится 29 мая 2017 года в 11.30**

Заявки на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.
Последний день подачи заявлений на участие в аукционе – 23 мая 2017 г. до 12.00.
Подробная информация по телефонам:
В городе Волковыске (01512) 4 50 25
В городе Гродно (0152) 77 29 15, 72 25 18.

УНП 500042135

**Извещение о проведении 12 июня 2017 года торгов с условиями по продаже недвижимого имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Минскремстрой»**

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества)** | «Административное помещение» общей площадью 104,8 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Ботаническая, д. 7а, пом. 3Н (инв. номер в ЕГРНИ: 500/D-70777653; назначение: административное помещение) |
